Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЛІСТАПАДА 2016 г. АЎТОРАК № 220 (28330)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Жыць побач і ў міры**

СТАР. 5



**Жанчыны роду Радзівілаў**

СТАР. 9



**Беларускі амерыканскі футбол**

СТАР. 12

# ТРЭБА ГЛЯДЗЕЦЬ У БУДУЧЫНЮ



**Падчас рабочых паездак у Віцебскую і Магілёўскую вобласці Прэзідэнт паставіў задачы, актуальныя для ўсёй краіны**

**Рабочы графік Прэзідэнта апошнія некалькі дзён быў запоўнены паездкамі па краіне. Гэтым разам у цэнтры ўвагі Аляксандра Лукашэнкі быў усход Беларусі. У суботу кіраўнік дзяржавы правёў нараду аб перспектывах развіцця малых населеных пунктаў Аршанскага і Шклоўскага раёнаў, прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця Лядовай арэны ў Шклове. Учора Прэзідэнт у ходзе рабочай паездкі ў Магілёўскую вобласць азнаёміўся з выкананнем яго даручэнняў аб добраўпарадкаванні і архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі мікрараёнаў і асноўных транспартных магістраляў Магілёва, перспектывамі развіцця абласнога цэнтра, а таксама з работай аднаго з самых значных прадпрыемстваў горада — ААТ «Магілёўхімвалакно».**
**Задачы, пастаўленыя Прэзідэнтам падчас гэтых паездак, датычыліся розных сфер нашага жыцця, і не асобных рэгіёнаў, а краіны ў цэлым. Іх вырашэнне адпавядае рэаліям і патрабаванням цяперашняга часу.**

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*



Фота БЕЛТА.

**Прэзідэнт у Магілёве таксама азнаёміўся з рэканструкцыяй аўтамабільнага моста цераз раку Днепр па Пушкінскім праспекце.**

## *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Сяргей РУМАС, старшыня праўлення ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь»:**

*«Падтрымка прадпрымальніцтва — адзін са складальнікаў паспяховага функцыянавання эканомікі краіны. Ужо сёння ў Беларусі мы назіраем скарачэнне працуючых у дзяржсектары з прычыны яго рэструктурызацыі і мадэрнізацыі асноўных сродкаў. Збалансаваць гэтую тэндэнцыю ў сферы занятасці пад сілу прыватнаму бізнесу з яго смелымі ідэямі і гнуткім мысленнем. Таму зараз самы час задумацца над пытаннем, што кожны з нас можа рабіць добра. І з улікам такога аналізу магчымасцяў пачаць дзейнічаць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9586 | ▲ |
| Еўра | 2,1120 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0297 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0759 | ▲ |

■ З першых вуснаў

# КУРС НА АПТЫМАЛЬНЫЯ РАШЭННІ



**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА расказаў у інтэрв'ю нашаму карэспандэнту пра новы парламент**

***— Уладзімір Паўлавіч, на сёлетніх парламенцкіх выбарах свае прадстаўніцтва ў Палаце прадстаўнікоў атрымалі некалькі партый, у тым ліку апазіцыйнага іміджу. На вашу думку, як гэта адаб'ецца на рабоце палаты?***

— Прадстаўнікі партый былі і ў ранейшых скліканнях. Ніякай надзвычайшчыны тут няма. Я ўпэўнены, парламент працаздольны. Істотна абноўленаму дэпутацкаму складу давядзецца папрацаваць вельмі інтэнсіўна, каб забяспечыць законамі задачы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Усе дэпутаты — людзі прафесіянальныя і, думаю, гэта разумеюць.

***— Новае месца работы адкрывае чалавеку нейкія новыя магчымасці. Якія яны ва ўладальнікаў дэпутацкіх мандатаў, выбраных у Палату прадстаўнікоў упершыню?***

— Гэта шанц папрацаваць на ўсю сілу свайго патэнцыялу ў інтарэсах краіны і грамадства. Вось такая магчымасць. Яна ёсць ва ўсіх дэпутатаў.

***— Ёсць, але ж партыі трактуюць інтарэсы краіны і грамадства па-рознаму.***

— Заканадаўчы і прадстаўнічы орган дзяржавы працуе не ў партыйных ці карпаратыўных, а ў нашых нацыянальных, народных, дзяржаўных інтарэсах і ў канстытуцыйным рэчышчы. Адсюль і адпаведная заканадаўчая палітыка.

***— Што вы лічыце найбольш важным для парламента?***

— Найбольш важным? Яго кансалідуючую пазіцыю, здольнасць знаходзіць адэкватныя і аптымальныя заканадаўчыя адказы на сучасныя выклікі і грамадскія патрэбы. Будзем імкнуцца працаваць менавіта ў гэтым ключы. Нямала пытанняў эканомікі і грамадскага жыцця вымагаюць сур'ёзнай парламенцкай увагі і глыбокай аналітыкі.

***— Чаго, на вашу думку, не павінна быць у парламенце?***

— Мітынговага гвалту.

***— А як жа дыскусіі?***

— Дыскусіі не маюць да яго ніякага дачынення. Яны неад'емнасць заканатворчай работы. Але абавязкова павінны прыносіць канкрэтны станоўчы вынік, выводзіць на аптымальныя рашэнні.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА, 5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ТРЭБА ГЛЯДЗЕЦЬ У БУДУЧЫНЮ

## Развіццё вёскі — на новы ўзровень

Аб гэтым ішла размова на суботняй нарадзе ў Аршанскім раёне. Прэзідэнт згадаў аб тым, што для захавання сельгасвытворчасці і адраджэння вёскі за апошнія гады зроблена нямала. «Трэба пaглядзець у будучыню — вось галоўная задача, якой будзе вёска заўтра, што нам трэба пачынаць рабіць сёння», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, заўважыўшы пры гэтым, што вёска — гэта і людзі, і тыя месцы, дзе яны жывуць, і вытворчасці.

Гаворачы аб далейшым развіцці вытворчай сферы некалькіх аграгарадкоў Шклоўскага раёна са стварэннем комплекснай інтэграванай структуры на базе акцыянерных таварыстваў, Прэзідэнт заўважыў: «Вытворчасць і людзі — гэта добра, але важна яшчэ перапрацоўка і рэалізацыя прадукцыі. Калі ўвесь цыкл у адных руках, тады ёсць і прыбытак. Мы гэта ўмеем рабіць». Кіраўнік дзяржавы ў сувязі з гэтым папярэдзіў аб недапушчальнасці спыняцца ў развіцці гэтай сферы: «У нас ёсць такая прывычка паціраць рукі і радавацца, што мы забяспечылі харчовую бяспеку і вось-вось $5—7 млрд экспарту сельгаспрадукцыі на стол пакладзём, у краіну валюту прывязём. Мы павінны зрабіць крок наперад, прыцягваючы ініцыятыву і прыватны капітал». «Але майце на ўвазе: ніякага шарлатанства і штучнага аб'яднання і раз'яднання быць не павінна. Толькі спланаваўшы, мы павінны рэалізоўваць намечанае», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Што датычыцца прыходу прыватных інвестыцый у сельгасвытворчасць, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што падобныя паспяховыя прыклады ў Беларусі ўжо ёсць, і ў гэтым маецца пэўная перспектыва. Але гэта не азначае масавай прыватызацыі ў сферы сельскай гаспадаркі. «Будзем зыходзіць з таго, наколькі гэта выгадна», — заявіў ён.

Гаворачы аб эфектыўнасці, бачанні перспектыў і гаспадарскім падыходзе ў рэалізацыі наяўных задач па развіцці як асобных прадпрыемстваў, так і тэрыторый, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў рашэнні адпаведных пытанняў павінна быць задзейнічана ўся вертыкаль улады, пачынаючы ад кіраўніка пасялковага Савета. «Мы павінны дакладна вызначыцца, хто і чым павінен займацца. Старшыня пасялковага Савета павінен быць гаспадаром на гэтай зямлі. У частцы вытворчасці ён павінен мець пэўныя функцыі і паўнамоцтвы, — сказаў Прэзідэнт. — Але вертыкаль павінна працаваць. І трэба навучыцца зарабляць грошы».

У канцы нарады Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што праца кожнага чыноўніка, незалежна ад займаемай пасады, будзе падвергнута аналізу на прадмет эфектыўнасці. Адпаведнае даручэнне дадзена кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандру Косінцу. «Я яму даручыў, каб мне быў прадстаўлены поўны аналіз ад прэм'ер-міністра да старшыні райвыканкама — вынікі іх працы», — заявіў Прэзідэнт, папярэдзіўшы: хто «правaліць гэты год без аб'ектыўных прычын», на пасадзе не застанецца.

## Даць людзям зарабіць зарплату

Учора, падчас рабочай паездкі ў Магілёў, заслухоўваючы даклад аб перспектывах развіцця абласнога цэнтра, Прэзідэнт закрануў тэму цяперашняга ўзроўню зарплат, які лічыць недастатковым. «Рыхтуйцеся набраць сярэднюю зарплату на ўзроўні $500 у будучым годзе», — даручыў Аляксандр Лукашэнка. Разам з тым кіраўнік дзяржавы дадаў, што павышаць заработную плату без росту прадукцыйнасці працы немэтазгодна. «Я не гавару, што павінны плаціць незаробленыя грошы. Ні ў якім разе. Інакш мы вернемся да таго, з чаго пачыналі два гады таму. Мы павінны стымуляваць, падштурхоўваць кіраўнікоў прыватных і дзяржаўных прадпрыемстваў да таго, каб мы да $500 наблізіліся, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Трэба людзей падтрымліваць, чаго б гэта ні каштавала».

Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на стварэнне рабочых месцаў і працаўладкаванне грамадзян. «Гэта павінны быць новыя рабочыя месцы, падману тут ніякага не павінна быць, таму што будзеце падманваць самі сябе», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт таксама паставіў задачу больш актыўна працаваць са стратнымі прадпрыемствамі, асабліва з тымі, якім пагражае банкруцтва. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, неабходна зрабіць усё магчымае, каб яны працавалі. «Гэтыя фразы «абанкруцім праз санацыю» — вы проста палохаеце людзей і калектывы. Ніхто не дазволіць прадпрыемствы закрываць або бяздумна прадаваць. Трэба ад гэтага адысці раз і назаўсёды і ў сельскай гаспадарцы, і ў прамысловасці. Гэта мы банкруты, калі ў нас гаспадарка ці прадпрыемства такое, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Прадпрыемствы трэба ратаваць, каб людзі працавалі. Таму накіроўвайце туды каго хочаце (гэта ваша справа) і кіруйце, пакуль яно не выйдзе на нармальны ўзровень работы».

Кіраўніку дзяржавы далажылі аб выкананні яго даручэнняў аб добраўпарадкаванні і архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі мікраараёнаў і асноўных транспартных магістраляў горада, перспектывах развіцця абласнога цэнтра. Асноўныя работы па добраўпарадкаванні Магілёва павінны быць завершаны да 2020 года.

У час наведвання «Магілёўхімвалакна» Прэзідэнту далажылі аб перспектывах развіцця прадпрыемства, фінансава-эканамічных паказчыках, планах па рэалізацыі праектаў па выпуску новых перспектыўных відаў прадукцыі. Асобна былі абмеркаваны планы па развіцці вытворчай тэрыторыі «Магілёўхімвалакна», дзе ёсць шмат невыкарыстоўваемых памяшканняў і тэрыторый. Кіраўнік дзяржавы даў шэраг канкрэтных даручэнняў наконт гэтага.

Да 2020 года ў «Магілёўхімвалакна» за кошт мадэрнізацыі павінна быць створана зусім новае прадпрыемства, паставіў задачу Прэзідэнт.



ААТ «Магілёўхімвалакно» да 2020 года павінна цалкам мадэрнізавацца.

* * *

У час размовы з прадстаўнікамі працоўнага калектыву прадпрыемства Аляксандр Лукашэнка падзяліўся падрабязнасцямі ўсіх дзён рабочай паездкі ў Магілёўскую і Віцебскую вобласці.

У прыватнасці, гаворка ішла пра важнасць працягу эфектыўнага развіцця ў сферы аграпрамысловага комплексу, стварэння новых сацыяльных аб'ектаў на сяле і ў невялікіх гарадах.

Аляксандр Лукашэнка таксама даў высокую ацэнку прайшоўшаму афіцыйнаму візіту ў Беларусь Прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана і бізнес-форуму, які адбыўся. Гэта дазволіла фактычна адкрыць вароты для актывізацыі двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Гэта была вельмі добрая, пазітыўная сустрэча. У Прэзідэнта Турцыі, як ён мне сказаў сам-насам, ніколі не было такіх візітаў ні ў адну краіну», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Адказваючы на адно з пытанняў, Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў вынікі выбараў у ЗША, дзе на прэзідэнцкі пост быў абраны рэспубліканец Дональд Трамп. «Ён можа патрапіць у гісторыю, калі сапраўды за час прэзідэнцтва страсяне Амерыку, — заявіў беларускі лідар. — Людзі былі даведзены да таго, што рабочы клас за яго прагаласаваў, нягледзячы на тое, што ён багацей. Гэта значыць, унутры Амерыкі наспелі вельмі сур'ёзныя праблемы. І ў яго галоўнай задачай будзе рашэнне гэтых унутраных праблем. І не толькі за кошт друкавання долараў, што гэта таксама будзе мець негатыўныя наступствы».

Прэзідэнт расказаў, што прадчуваў магчымасць перамогі Дональда Трампа яшчэ некалькі месяцаў таму назад, назіраючы за ходам выбарчай кампаніі. Ён таксама разлічвае на далейшае прасоўванне беларуска-амерыканскага дыялогу.

Гаворка зайшла і аб правядзенні ў Беларусі ІІ Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе. «Мы палічылі, што нават у плюсе будзем. Нам трэба будзе выдаткаваць недзе пад $ 50 млн за гэтыя гады. Гэта слёзы для краіны. А можа, і таго не трэба: еўрапейцы сказалі, што дапамогуць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт растлумачыў, што перад тым як прапанаваць кандыдатуру Беларусі для правядзення гэтых спаборніцтваў, у краіне падлічылі, у колькі яны абыдуцца.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь гатова правесці ІІ Еўрапейскія гульні на сусветным узроўні.

**Паводле БЕЛТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Парламенцкі дзённік

# Не абмяжоўвацца тым, што ёсць

**Беларусь накіравана на пашырэнне шматпланавых кантактаў з Японіяй. Пра гэта ішла размова на сустрэчы старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіла МЯСНІКОВІЧА і кіраўніка Даследчага таварыства эканамічных і экалагічных аспектаў Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна Сіндзі КАВАСАКІ.**

Сенатар адзначыў, што ў Беларусі і Японіі шмат сумесных праектаў, аднак абмяжоўвацца гэтым не варта. «Мы павінны забяспечваць як эканамічныя, так і палітычныя кантакты. Галоўнае, хацелася б, каб гэтыя сувязі былі шматпланавымі», — сказаў спікер верхняй палаты парламента. Падчас сустрэчы ён прапанаваў засяродзіць увагу на парламенцкім супрацоўніцтве, а таксама на кантактах гаспадарчых суб'ектаў. Акрамя таго, Міхаіл Мясніковіч пацікавіўся меркаваннем японскага госця аб тым, што можа спрыяць больш паспяховаму прасоўванню эканамічных праектаў нашых краін.

Японская дэлегацыя паспела наведаць у Беларусі шэраг машынабудаўнічых заводаў, а таксама прадпрыемстваў, якія вырабляюць дазіметрычную тэхніку. У японскага боку ёсць канкрэтныя праекты. Чакаецца, што гэты візіт надасць сур'ёзны імпульс развіццю двухбаковых адносін, у тым ліку ў эканамічным плане.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# Акцэнт на тэхналагічнасць

**Апошнія дні мінулага тыдня прайшлі пад знакам «беларуска-турэцкага супрацоўніцтва». Сустрэча кіраўнікоў двух дзяржаў — Беларусі і Турцыі — і дасягнутыя імі дамоўленасці аб далейшай сумеснай рабоце, а таксама правядзенне буйнейшага бізнес-форуму дагэтуль застаюцца нагодай для абмеркавання. «Звязда» спытала ў членаў Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы аб тым, якімі яны ўбачаць перспектывы беларуска-турэцкага супрацоўніцтва.**



**Сяргей ГАЙДУКЕВІЧ, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі**, станоўча ацэньвае гэту падзею і бачыць у ёй два галоўныя аспекты. «Беларусь зараз вядзе мудрую знешнюю палітыку, выступаючы ў якасці міратворцы і ва ўкраінскім пытанні, і ў якасці пасрэдніка ў дыялогу паміж Расіяй і Еўропай», — мяркуе ён. На думку члена верхняй палаты беларускага парламента, Турцыя мае непасрэднае дачыненне да падзей на Блізкім Усходзе. Таму такое супрацоўніцтва робіць Беларусь спрычыненай да геапалітычных падзей, хоць напрамую наша краіна ў іх не ўдзельнічае.

Калі зірнуць з эканамічнага пункту гледжання, то мы можам выступаць «як мост паміж Расіяй, Еўропай і Турцыяй» у плане пастаўак прадукцыі і тавараў. Беларусь можа стаць пляцоўкай для стварэння сумесных беларуска-турэцкіх прадпрыемстваў, з улікам таго, што яна цяпер уключана ў больш буйныя міжнародныя аб'яднанні — Саюзную дзяржаву Беларусі і Расіі і Еўразійскі эканамічны саюз.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Алег РУМО, кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак, намеснік галоўнага ўрача па хірургічнай рабоце 9-й гарадской клінічнай бальніцы**, лічыць, што прыезд прэзідэнта такой буйной краіны і перспектыўнага эканамічнага партнёра Беларусі, як Турцыя, з якой мы развіваем супрацоўніцтва ў розных кірунках, успрымаецца з вялікім запалам. «Падтрымка на высокім узроўні, безумоўна, станоўча паўплывае на развіццё двухбаковых адносін нашых дзяржаў. Мяркую, у найбліжэйшы час узмоцніцца ўзаемны тэхналагічны ўплыў на асобныя галіны вытворчасці і навукі», — лічыць Алег Румо.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by* ■

# ПЫТАННЯЎ ВЯЛІКАЯ КОЛЬКАСЦЬ

## Пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы плануецца правесці ў пачатку снежня

**Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ на сустрэчы з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам РАПОТАМ, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы цяпер напярэдадні двух важнейшых мерапрыемстваў у рамках Саюзнай дзяржавы. Да канца года мы павінны правесці пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы і разлічваем, што яно адбудзецца ў пачатку снежня. Ёсць даручэнне таксама падрыхтаваць пасяджэнне Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы — яно магчыма ў канцы бягучага года альбо ў самым пачатку наступнага года», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Да пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета плануецца падрыхтаваць шэраг дакументаў, якія датычацца перш за ўсё бюджэтнай сферы. «Мы павінны прайсці шмат важных працэдурных пытанняў, перш чым выйсці з гэтымі дакументамі на пасяджэнне Вышэйшага дзяржсавета», — нагадаў прэм'ер-міністр.

У папярэдні парадак дня пасяджэння Саўміна СД уключана 24 пытанні. «Гэта шырокі парадак дня, у пэўнай ступені гэта звязана з тым, што мы вырашылі сустракацца ў такім рэжыме раз у паўгода — напэўна, такая частата не зусім будзе задавальняць нас, таму што выключаць што-небудзь з абмяркоўваемых пытанняў немагчыма, усе яны важныя і цікавыя», — канстатаваў Андрэй Кабякоў. У прыватнасці, на бліжэйшым пасяджэнні Саўміна СД давядзецца абмеркаваць рэалізацыю саюзных праграм. Кіраўнік беларускага ўрада лічыць неабходным дэталёва спыніцца на гэтым пытанні, а не проста канстатаваць выкананне або невыкананне праграм.

«Напэўна, трэба гаварыць аб тым, што мы павінны будзем усё ж такі сустракацца часцей. На гэты момант неабходна адпрацаваць ужо існуючы парадак дня і выйсці на дамоўленасці, у якіх зацікаўлены бакі. Пытанняў вялікая колькасць, у тым ліку праблемных, і мы іх будзем вырашаць», — рэзюмаваў Андрэй Кабякоў.

# КУРС НА АПТЫМАЛЬНЫЯ РАШЭННІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— У Авальнай зале ў мінулым дэпутацкім скліканні дыскусійнага напалу пры абмеркаванні законапраектаў не заўважалася. Чаму?***

— Таму што яшчэ да прыняцця законапраекта ў першым чытанні ўсе найбольш важныя моманты і прынцыповыя пазіцыі ўзгадняюцца ў пастаянных камісіях і на пасяджэннях рабочых груп. Адпрацавана сістэма ўзаемадзеяння з нашымі заканатворчымі партнёрамі. Гэта правільна. Чым больш дэталёва і карпатліва ўзгоднены закон яшчэ на папярэднім этапе абмеркавання, тым прасцей і лягчэй ідзе яго разгляд і галасаванне па ім у Авальнай зале.

***— Напэўна, няпроста ўваходзіць у заканатворчую работу дэпутату, які раней не займаўся ёю?***

— Вядома, новаабраным дэпутатам патрэбен пэўны час для адаптацыі. Але новы парламент пачынае не з чыстага ліста. Многія напрацоўкі папярэдніх скліканняў не страчваюць сваёй значнасці. Да таго ж захавана пераемнасць дэпутацкага складу. Навічкі могуць звярнуцца да калег за парадай, пракансультавацца, параіцца. У профільных камісіях за кожным законапраектам замацаваны дэпутат і спецыяліст нашага сакратарыята. Яны адказваюць за падрыхтоўку дакумента на ўсіх этапах заканатворчай лесвіцы. У найбліжэйшы час мяркуем правесці для дэпутатаў семінар аб заканатворчым працэсе ў Рэспубліцы Беларусь. Мы маем арганізацыйны, прававы, экспертны, тэхнічны і інфармацыйна-аналітычны базіс, які дазваляе арганічна ўвайсці ў заканатворчасць і ў пытанні парламенцкага жыцця.

***— Над якімі рэзананснымі законапраектамі цяпер працуюць у пастаянных камісіях?***

— Сярод заканадаўчых ініцыятыў эканамічнай накіраванасці — гэта праект нового закона аб інвестыцыйных фондах, змяненні і дапаўненні ў некаторыя законы па пытаннях дзяржаўна-прыватнага партнёрства і ў закон аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг). У блоку законапраектаў сацыяльнага характару назаву карэкціроўку заканадаўства аб пенсійным забеспячэнні і дзяржаўным сацыяльным страхаванні, аб працоўных адносінах, закона аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў для жыцця і здароўя чалавека, а таксама закона аб дзяржаўнай дапамозе сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Уносяцца таксама змяненні і дапаўненні ў некаторыя законы аб пітцявым водазабеспячэнні. Ідзе дапрацоўка і ўзгадненне гэтых і іншых дакументаў ва ўстаноўленым парадку.

***— Кім ён устаноўлены?***

— Заканадаўствам і Рэгламентам Палаты прадстаўнікоў — нашымі ўнутранымі правіламі. Ніякай «адсябяціны» ў заканатворчай рабоце, у тым ліку ў працэдурных пытаннях, няма. Гэта робіць заканадаўчы працэс арганізаваным і зладжаным, працуе на якасць законаў.

***— Як вы лічыце, што такое якасны закон?***

— Гэта своечасовасць, прагназуемасць і станоўчы вынік рэалізацыі. Я так бы вызначыў ключавыя складнікі. А перадумова ўсяго гэтага — аб'ектыўная, глыбокая ацэнка таго, што адбываецца ў рэгулюемай сферы, і перспектыў прымянення новых прававых мер. Пастаянны маніторынг сітуацыі на месцах. Скажу вам, няпростая, працаёмкая праца. Да таго ж заўсёды апеадыжальная. У заканадаўстве ўвасабляецца тое, што адпавядае сацыяльна-эканамічным і іншым задачам краіны і грамадскім запытам.

***— На ваш погляд, які цяпер галоўны запыт грамадства да парламента?***

— Выбары ў Палату прадстаўнікоў паказалі, што такім запытам з'яўляецца захаванне грамадска-палітычнай стабільнасці, эканамічнае ўмацаванне краіны і яе бяспека. Мы будзем яго рэалізоўваць у парламенцкіх справах.

**— Якім вам бачыцца асноўны вектар дзейнасці новага парламента ў міжнародным супрацоўніцтве?**

— Гэта прасоўванне нацыянальных інтарэсаў Беларусі ва ўсіх фарматах нашага міжнароднага і міжпарламенцкага дыялогу і ўзаемадзеяння. У апошнія гады, дзякуючы ініцыятывам і палітычнай волі Прэзідэнта, узмацняюцца пазіцыі Рэспублікі Беларусь у свеце. Разам з гэтым пазітыўным працэсам умацоўваецца роля Нацыянальнага сходу на міжнароднай арэне. Папярэднім скліканнем парламента ўстаноўлены міжнародныя сувязі шырокага геаграфічнага дыяпазону, у тым ліку на еўрапейскім, азіяцкім, амерыканскім і афрыканскім кантынентах. Мы будзем пашыраць іх і рухаць наперад. Найперш — у напрамку развіцця супрацоўніцтва з іншымі краінамі ў гандлёва-эканамічнай галіне, нарошчвання дагаворна-прававой базы, неабходнай для сталых і ўзаемавыгадных міждзяржаўных і міжпарламенцкіх адносін.

І яшчэ адно хацеў бы акцэнтаваць. Як пацвярджае вопыт Саюзнай дзяржавы і Еўразійскага эканамічнага саюза, прамы дыялог паміж заканадаўцамі дапамагае хутчэй прыйсці да пагаднення па важных пытаннях. Гэта пасведчыла і ўмацаванне шырокафарматных сувязей з краінамі Паўднёва-Усходняй Азіі. Больш частымі, прадметнымі і ўзаемазацікаўленымі становяцца нашы кантакты з парламентарыямі Еўрасаюза і еўрапейскімі парламенцкімі структурамі. Яны маглі пераканацца, што беларускі парламент імкнецца да раўнапраўнага, прагматычнага ўзаемадзеяння. Мы ўпэўнены — праз развіццё дыялогу на аснове ўзаемапавагі, узаемаразумення і цвярозага розуму рух наперад магчымы. Як ужо паведамлялася, у ліпені 2017 года ў Мінску адбудзецца сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Цяпер ідзе падрыхтоўка да гэтага вялікага форуму. Так што мы маем апорныя канструкцыі для далейшага развіцця парламенцкай дыпламатыі — складніка знешняй палітыкі Беларусі — палітыкі міралюбства, аб'яднання намаганняў міжнароднай супольнасці ў супрацьдзеянні агульным выклікам і пагрозам і ў пераадоленні існуючых у міжнародных адносінах праблемных пытанняў і бар'ераў, якая знаходзіць усё большую падтрымку ў свеце.

**— Новаабраныя дэпутаты звычайна кажуць, што ім аказаны крэдыт даверу і яны пастараюцца яго апраўдаць. Думаю, гэта не проста дзяжурная фраза з нагоды. Такая настроенасць у іх, несумненна, ёсць. Але крэдыт, як вядома, патрэбна вяртаць своечасова і да таго ж з працэнтамі. Як вы мяркуеце, якіх «працэнтаў» чакаюць выбаршчыкі ад свайго дэпутата?**

— Вырашэння канкрэтных праблем, важных для іх і для развіцця рэгіёна. Асабліва пытанняў сацыяльнай значнасці. Таму арыентуем дэпутатаў на гэта.

***— Уладзімір Паўлавіч, у Палаце прадстаўнікоў праходзіць першая сесія. Дэпутаты аператыўна, на хвалі прыўзнятага настрою, выбралі кіраўніцтва, сфарміравалі рабочыя органы, правялі першыя паездкі ў свае выбарчыя акругі. Пачаліся насычаныя справамі парламенцкія будні. Цікава, якім вы хацелі б бачыць цяперашні парламент праз чатыры гады, на фінішы яго паўнамоцтваў?***

— Парламентам высокай эфектыўнасці. Думаю, гэтая мэта вартая таго, каб яе спраўдзіць.

**Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.**

■ Грамадзянская супольнасць

# Працаваць на давер людзей

**На днях члены рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» падвялі вынікі ўдзелу ў парламенцкай кампаніі. Акрамя гэтага, удзельнікі арганізацыі абмеркавалі магчымыя формы ўзаемадзеяння дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з «Белай Руссю».**



Фота БЕЛТА

— Удзел нашай арганізацыі ў выбарчай кампаніі — гэта ўжо не проста традыцыя, а палітычная неабходнасць, — падкрэсліў у сваім выступленні **старшыня аб'яднання Аляксандр РАДЗЬКОЎ**. — З 2008 года «Белая Русь» прымае ўдзел у выбарчых кампаніях дэпутатаў усіх узроўняў». Падчас выбараў арганізацыя вылучала членаў ва ўчастковыя камісіі, прадастаўляла офісы для кандыдатаў — членаў «Белай Русі» і аказвала сур'ёзную падтрымку ў фарміраванні выбарчых фондаў сваіх кандыдатаў. Усе дзеянні былі ўзгоднены са стратэгіяй, прынятай на адным са з'ездаў грамадскага аб'яднання.

Акрамя таго, у перыяд выбараў «Белая Русь» актыўна супрацоўнічала з міжнароднымі арганізацыямі. Па словах Аляксандра Радзькова, пацвярджэннем палітычнага аўтарытэту аб'яднання з'яўляецца той факт, што з пачатку кампаніі назіральнікі АБСЕ наведалі практычна ўсе структуры арганізацыі. Міжнародныя назіральнікі неаднаразова падкрэслівалі, што задаволены супрацоўніцтвам з «Белай Руссю».

У выніку электаральнай кампаніі большасць выбраных дэпутатаў — гэта члены «Белай Русі». На думку Аляксандра Радзькова, дэпутатам новага склікання трэба будзе прымаць рашэнні, якія дапамогуць пераадолець негатыўныя з'явы ў эканоміцы. Плённая работа ў першую чаргу павінна быць заснавана на даверных адносінах з грамадзянамі, бо законапраекты, рашэнні дэпутатаў павінны прыносіць карысць грамадству.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

■ Будзь у курсе!

# ПА КРАІНЕ ПРАНЯСЕЦЦА «СТРЫЖ»

## Білеты на новы хуткі цягнік ужо ў продажы

**17 снежня па Беларускай чыгунцы ўпершыню пройдзе хуткі цягнік зносінамі Масква — Берлін Swift («Стрыж»).**



Магістраль забяспечыць беспрашкодны паскораны пропуск па тэрыторыі краіны цягніка №13/14 Масква —Берлін Swift («Стрыж»), які робіць прыпынкі ў Оршы, Мінску і Брэсце.

Асаблівасць цягніка вытворчасці іспанскай кампаніі ў тым, што ён сфарміраваны з вагонаў, абсталяваных сістэмай аўтаматычнай змены шырыні колавых пар. У 2015 годзе на станцыі Брэст Беларуская чыгунка ўстанавіла спецыяльна абсталяванае пераводнае ўстройства для пропуску цягнікоў тыпу іспанскага «Тальга». Яно дазваляе скарацісць час на пераход з шырокай каляіны (1520 мм) на вузкую (1435 мм). Цягніку Swift спатрэбіцца каля 30 хвілін для праходжання праз гэтае ўстройства. Для параўнання, сёння пропуск звычайных цягнікоў на станцыі Брэст складае каля двюх гадзін (уключаючы перастаноўку саставаў з шырокай на вузкую каляіну шляхам замены вагонных калясак, а таксама правядзенне пагранічнага і мытнага кантролю).

Такім чынам, адлегласць ад Масквы да Берліна цягнік будзе пераадольваць за 20 гадзін 14 хвілін (цяпер час у дарозе складае 24 гадзіны 49 хвілін), а ад Берліна да Масквы — 20 гадзін 35 хвілін (у цяперашні час — 25 гадзін 56 хвілін).

Цягнік Swift будзе курсіраваць два разы на тыдзень. З Масквы ён будзе адпраўляцца па суботах і нядзелях у 13.05 і прыбываць на станцыю Берлін Остбанхоф у 7.19 наступных сутак (па мясцовым часе). Пры гэтым у дарозе па Беларусі састаў будзе рабіць тры прыпынкі: у Оршы (прыбыццё — 18.32, адпраўленне — 18.47), Мінску (прыбыццё — 20.55, адпраўленне — 21.09) і Брэсце (прыбыццё — 0.24, адпраўленне — 0.32).

З Берліна поезд будзе адпраўляцца па нядзелях і панядзелках у 18.50 (па мясцовым часе). На зваротным шляху ў Брэст ён прыбудзе ў 5.38 наступных сутак, у Мінск — у 9.12, а ў Оршу — у 11.43. На Курскі вакзал Масквы састаў прыбудзе ў 17.25.

Продаж білетаў на новы пасажырскі цягнік №13/14 Swift зносінамі Масква — Берлін ужо адкрыты. Больш падрабязна з раскладам руху саставу можна азнаёміцца ў чыгуначных касах і па тэлефонах даведачных службаў, а таксама на сайце Беларускай чыгункі www.rw.by.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Факт

# Бездадходная вытворчасць

## Капыльскія сыраробы асвоілі новы від прадукцыі

**Капыльскі філіял адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі сыраробны камбінат» у наступным годзе пачне выпускаць сухую дэмінералізаваную малочную сыроватку.**

Раней сыроватку наогул вылівалі ў ачышчальныя збудаванні. Цяпер на заводзе наладжана безадходная вытворчасць сыроваткі шляхам яе высушвання. У далейшым тут ставяць задачу па павышэнні яе якасці. У Чэхіі закуплена абсталяванне, якое дазволіць давесці сыроватку да ступені дэмінералізацыі 80—90%.

Па словах **дырэктара філіяла Івана ГОРБАЧА**, ініцыятар праекта коштам 1,26 млн еўра — само прадпрыемства. Крэдытныя рэсурсы для гэтых мэт не прыцягваюцца. За кошт асабістых сродкаў ужо пабудаваны цэх для ўстаноўкі абсталявання: першыя плацяжы ўнесены і ў найбліжэйшай перспектыве яно пачне паступаць на завод. Мантаж абсталявання плануецца завяршыць да канца гэтага года, а выпуск новага віду прадукцыі мяркуецца пачаць у 2017-м.

Такая сыроватка выкарыстоўваецца ў кандытарскай, хлебнай вытворчасці. Яна ў 2-2,5 раза даражэйшая, чым звычайная. І вельмі запатрабавана на рынку Расійскай Федэрацыі. У перспектыве магчымы пастаўкі новай прадукцыі на рынкі іншых краін Еўразійскага эканамічнага саюза. Як адзначыў Іван Горбач, праект павінен апраўдаць сябе за год-паўтара. Напрыклад, у 2010-м быў адкрыты цэх па вытворчасці сухога абястлушчанага малака і сухой малочнай сыроваткі. Планавалася, што праект акупіцца за чатыры гады. Аднак гэты тэрмін аказаўся амаль удвая меншым.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ Цёплыя сустрэчы

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

# «ПРЫЕМНА, ШТО МОВА Ў «ЗВЯЗДЗЕ» ПРАВІЛЬНАЯ»

**Кожны прыезд карэспандэнтаў «Звязды» ў розныя беларускія мястэчкі падчас Дня падпісчыка поўніцца нечаканымі прыгодамі ды непрадбачанымі сустрэчамі. Усякі раз, сустракаючыся з чытачамі, адчуваеш прыемнае хваляванне і атрымліваеш задавальненне ад пытанняў людзей, іх цікаўнасці да газеты, зваротаў па падтрымку. Так здарылася і гэтым разам, падчас размовы ў Карэліцкім раённым цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, куды прыйшлі людзі сталага ўзросту, якія займаюцца там у гуртках.**

Вельмі парадавала, што нашы падпісчыкі застаюцца вернымі выданню. Калі, здараецца, не выпадае выпісаць «Звязду» своечасова, яны кажуць, што ходзяць чытаць яе ў бібліятэку. А ў цэнтры бабулям дапамагаюць «гартаць» найбольш цікавыя публікацыі на сайце — так і камп'ютар асвойваць прасцей.

Пагутарылі мы з карэліччанамі і пра беларускую мову. Жыхары ўспомнілі часы сваёй маладосці і цяжкасці, з якімі сутыкнуліся, калі ездзілі паступаць у сталіцу пасля вясковай школы. «Мы ж усё па-беларуску вучылі, і гаварылі на мове. Дык выкладчыкі пастаянна перапытвалі, бо не разумелі, што ім казалі. Пасля дзясяцей сваіх мы ўжо стараліся да рускай мовы прызвычайваць. Але ж усё роўна «па-мясцоваму» гаворым, і наша пакаленне ўжо не пераробіш. І чытаць па-беларуску зусім не складана — наадварот, прыемна, што мова ў «Звяздзе» ды нашым раённым «Полымі» правільная, а не як у вуснай гутарцы бывае: слова па-беларуску, два па-руску. Думаем, мова ўсё ж такі вернецца ў штодзённы ўжытак».

Разважаючы пра былое, жыхары прыгадалі, што ў канцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя Карэлічы былі вёска-вёскай, а цяпер «і дамы, і дарогі добраўпарадкаваныя, і выбар вялікі што на выданні, што на паслугі. І кіраўніцтва раёна ветлівае, ведае кожнага. Старшыня як сустрэне — абавязкова павітаецца, спытаецца пра жыццё».

Так неўзабаве ў размовах праляцела амаль гадзіна: жанчыны вярнуліся да сваіх заняткаў у гуртках, а мы накіраваліся на мясцовую пошту, дзе ўжо чакалі сапраўдныя чытачы нашай газеты і, магчыма, будучыя.

Ганне Запольскай параілі наведацца на пошту суседзі. 71-гадовая жанчына прыйшла да карэспандэнтаў «Звязды» расказаць пра сваё жыццё ды падзяліцца навінамі. Ужо доўгі час яна жыве ў «падменцы», якую Ганне Мікалаеўне выдзеліл пасля таго, як яе хата згарэла. Цяпер у часовым доме не працуе грубка і жыць немагчыма, сваякоў і дзяцей у пенсіянеркі няма... Жанчына некалькі гадоў жыла і працавала пры манастыры ў Жыровічах, а ў Карэлічы, дзе яна атрымлівае пенсію па месцы прапіскі, наведвалася час ад часу. Сёлета ж вырашыла асесці ў Карэлічах.

Яе праблему добра ведаюць і сацыяльныя, і камунальныя службы Карэліч. Тутэйшыя ўлады пайшлі насустрач адзінокай бабулі, калі даведаліся, што яна хоча застацца жыць у мястэчку. У панядзелак Ганна Запольская засялілася ў інтэрнацкі пакой, пры якім усе выгоды: маленькая ўласная кухня, ванна і туалет.

Вось так давялося яшчэ раз пераканацца, што праблемы ды пытанні маюць рашэнні — варта толькі расказваць пра іх і не маўчаць.

**Ірына СІДАРОК.**
sidarok@zviazda.by

■ Надвор'е

# З СЕРАДЫ ПАЧНЕ ЦЯПЛЕЦЬ

## Бліжэй да выхадных дзённая тэмпература будзе дасягаць ужо плюс 8 градусаў

**На гэтым тыдні ў Беларусь прыйдзе пацяпленне, а снег зменіцца дажджамі і туманамі, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**



У аўторак на тэрыторыю Беларусі завітае малаактыўны атмасферны фронт і месцамі пройдзе невялікі снег. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. Істотная змена надвор'я чакаецца ўжо на наступны дзень. Спецыяліст упэўнены, што з серады і да канца тыдня на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць атлантычны цыклон, які нясе сагрэтыя Гальфстрымам больш цёплыя і вільготныя паветраныя масы. Паўночныя ветры зменяцца на заходнія і паўднёва-заходнія, а тэмпература паветра пачне паступова павышацца. У сераду ўначы ў заходніх раёнах, а ўдзень і ў цэнтральных раёнах Беларусі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу (на захадзе). У асобных раёнах магчымы туман, слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 да плюс 1 градуса, удзень — ад 3 марозу да 3 цяпла.

Сапраўды актыўна цяплець пачне ў чацвер, калі паўсюдна па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі (мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж). У асобных раёнах магчымы туман, слабы галалёд, а на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 1 градуса да 6 цяпла. «Час снегавіка» развітаецца з намі ў пятніцу, калі на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць выключна дажджы. Аднак па паўночным усходзе чакаецца слабы туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 1 марозу да 5 цяпла, а ўдзень будзе плюс 1—6 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 8 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, восеньскае надвор'е будзе гаспадарыць у нас і ў выхадныя. Чакаецца, што ў суботу паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, удзень — ад 1 да 6 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 8 градусаў. Дождж і дождж з мокрым снегам пранізуецца і ў нядзелю. Уначы і раніцай чакаецца слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, удзень — 1—8 цяпла. Што ні кажы, але сярэдзіна лістапада — гэта яшчэ восень.

**Сяргей КУРКАЧ.**
kurkach@zviazda.by

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### АЎТОБУСЫ — ПАД ПІЛЬНЫ КАНТРОЛЬ ДАІ

**У мэтах прафілактыкі аварыйнасці ў пасажырскім транспарце з 14 па 23 лістапада сталічная Дзяржаўтаінспекцыя праводзе комплекс мерапрыемстваў пад назвай «Аўтобус».**

Супрацоўнікі ДАІ ўдзеляць асаблівую ўвагу выкананню кіроўцамі грамадскага транспарту патрабаванняў Правіл дарожнага руху, а таксама ўзмоцняць кантроль за тэхнічным станам указаных транспартных сродкаў. За дзесяць месяцаў на тэрыторыі Мінска па віне кіроўцаў аўтобусаў адбылося 34 дарожна-транспартныя здарэнні з пацярпелымі, у якіх тры чалавекі загінулі і 54 атрымалі раненні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ДВА МАЛАДЫЯ ЖЫЦЦІ...

**Аварыя ў вёсцы Ставы Камянецкага раёна адбылася 14 кастрычніка раніцай. 20-гадовы хлопец са сваім равеснікам ехалі на машыне па вуліцы Свярдлова. І тут жа, на вясковай вуліцы, малады вадзіцель паспрабаваў абагнаць іншы транспартны сродак. А пры абгоне не разлічыў сілы і вопыт, машына выйшла з-пад кантролю, на поўнай хуткасці пратараніла бетонную агароджу і ўрэзалася ў дрэва.**

Пярэдняя частка аўтамабіля пасля аварыі ператварылася ў незразумелае месіва. Абодва хлопцы загінулі на месцы. Як паведамілі ў Брэсцкім абласным упраўленні ДАІ, вадзіцель той злашчаснай машыны ніколі не атрымліваў пасведчання на кіраванне, абодва яны не былі прышпіленыя рамянямі бяспекі. Ехалі так, нібы шукалі смерць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### ПРАДАВАЎ МАРЫХУАНУ Ў КАЗІНО

**Супрацоўнікі аддзялення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі 21-гадовага мінчаніна, які займаўся распаўсюджваннем марыхуаны.**

— Маладога чалавека затрымалі на здымнай кватэры. Падчас асабістага вобыску і агляду жылога памяшкання было знойдзена больш за 250 грамаў марыхуаны, электронныя вагі і прадметы для фасоўкі, — расказала прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля Ганусевіч. — Як патлумачыў затрыманы, наркотык ён рэалізоўваў у сталічным казіно, дзе працаваў адміністратарам. Раней хлопец не быў судзімы. Зараз яму пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці ці без канфіскацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Вынікі тыдня



# ЦІ ЧАКАЦЬ ПЕРАМЕН?

## Нядаўнія падзеі могуць аказаць важкі ўплыў на сусветную палітыку

Безумоўна, галоўнай навіной тыдня былі **вынікі выбараў у ЗША**, што сталі сюрпрызам для большасці. Дональд Трамп, які стаў прэзідэнтам адзінай звышдзяржавы сучаснасці, мае намер рэзка змяніць унутраную і знешнюю палітыку. Мноства краін, якія былі партнёрамі ЗША да гэтага часу, цяпер спрабуюць прадказаць характар магчымых змен пасля займання ім пасады ў студзені 2017 года. Трамп з'яўляецца прыхільнікам ізаляцыянізму, мяркуючы, што чым менш ЗША ўмешваюцца ў розныя справы па-за сваімі межамі, тым лепш для яго дзяржавы. Гэта азначае, што краіны, якія спадзяваліся на ЗША як на гаранта сваёй бяспекі, пачалі адчуваць сябе няўпэўнена. Найбольш складаная сітуацыя ў Японіі, Паўднёвай Карэі і Украіне. Японія і Паўднёвая Карэя баяцца застацца сам-насам з Кітаем, пасля таго, як многія дзесяцігоддзі дапамагалі ЗША ствараць для яго праблемы. Украіна, нягледзячы на падпісанне мінскіх дамоўленасцяў па вяртанні Данбаса, так і не выканала ніводзін пункт пагаднення, што раздражняе Германію і Францыю, але задавальняе ЗША. Цяпер прэзідэнтам ЗША становіцца чалавек з выразна выяўленымі сімпатыямі да Расіі, які можа запатрабаваць выканаць мінскія пагадненні, а, акрамя гэтага, прызнаць статус Крыма ў складзе Расіі. Складаней становіцца і сітуацыя Літвы і Латвіі. Апошнія гады з іх боку гучалі нашмат больш рэзкія заявы ў адрас Расіі, чым ад многіх буйных дзяржаў Захаду. Усё гэта рабілася з улікам магутнай падтрымкі ЗША. А цяпер, цалкам магчыма, адказваць за сапсаваныя адносіны з Расіяй давядзецца самастойна.



Вярхоўны прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі **Федэрыка МАГЕРЫНІ выступіла з кансалідаванай пазіцыяй ЕС па Расіі** адразу ж пасля праведзенай экстраннай сустрэчы міністраў замежных спраў. Яе сэнс у тым, што нават калі ЗША адмовяцца ад папярэдняй палітыкі санкцый у дачыненні да Масквы, Расія, не змяніўшы сітуацыю ў Крыме і на Данбасе, не атрымае пазітыўных змен з боку ЕС. У той жа час не ўсё так проста. Калі пры Дональдзе Трампе з ЗША ў Расіі пачнецца разрадка, дамовіцца з ЕС, улічваючы, што там 28 дзяржаў, Маскве будзе значна прасцей. Менавіта ЗША з'яўляюцца галоўным фактарам халоднай вайны Расіі з Захадам, і без жадання Вашынгтона яе працягваць, Еўрасаюз сам яе не пацягне.

**Выбары ў Малдове і Балгарыі,** што прайшлі ў нядзелю, як і чакалася, прывялі на прэзідэнцкія пасады людзей, якія настойваюць на паляпшэнні адносін з Расіяй. Абодва прэзідэнты вылучаліся на выбары пры падтрымцы сацыялістычных партый. Прычым, калі новы прэзідэнт Балгарыі пацвердзіў захаванне курсу на членства ў НАТА і ЕС, і ён не валодае сур'ёзнымі паўнамоцтвамі, то ў выпадку з Малдовай усё інакш. Прэзідэнт Малдовы мае досыць значныя паўнамоцтвы, у тым ліку права роспуску парламента і вылучэння кандыдатуры прэм'ер-міністра. І ён заявіў, што, як і сацыялістычная партыя, якая вылучыла яго, прытрымліваецца курсу на еўразійскую інтэграцыю. У перадвыбарнай агітацыі ён абяцаў таксама захаваць асаблівыя стасункі з ЕС, уключаючы бязвізавы рэжым. Наколькі ён зменіць знешнюю палітыку Малдовы, заняўшы высокую пасаду, мы хутка ўбачым, але для ўзняцця прэстыжу Расіі ў рэгіёне падобныя перамогі маюць значэнне.

Па выніках сустрэч **кіраўнікоў урадаў Кітая і Расіі** было прынята рашэнне аб заказе ў Расіі двух новых энергаблокаў расійскага дызайну на пляцоўцы Цяньваньскай АЭС. Акрамя таго, плануюцца і іншыя заказы па будаўніцтве атамных станцый на новых пляцоўках у Кітаі, таксама будзе развівацца супрацоўніцтва па плывучых атамных станцыях. Выбар урадам Кітая, які валодае велізарнымі фінансавымі рэсурсамі, менавіта расійскай кампаніі, яшчэ раз характарызуе надзейнасць новых станцый, якія ўзводзяцца Расіяй за мяжой, што супярэчыць агітацыі Літвы супраць будаўніцтва АЭС у Беларусі.

На высокім узроўні адносін, болей сяброўскіх, чым афіцыйных, прайшоў **візіт у Беларусь кіраўніка турэцкай дзяржавы.** Рэджэп Таіп Эрдаган выказаў намер садзейнічаць росту тавараабароту і пашырыць кірункі развіцця стасункаў з нашай краінай. Цяперашні тавараабарот — 630 мільёнаў долараў па выніках 2015 года — ужо не адпавядае маштабам супрацоўніцтва. Новай планкай можа стаць тавараабарот памерам у адзін мільярд долараў. І той факт, што ў беларуска-турэцкім бізнес-форуме ўзялі ўдзел дзвесце турэцкіх бізнесменаў, гаворыць аб патэнцыяльным маштабе нашых адносін. Сур'ёзныя перспектывы ёсць у супрацоўніцтве ў сферы машынабудавання. МАЗ ужо ажыццяўляе зборку сваіх машын на тэрыторыі Турцыі, ёсць сэнс там мець заняцца і МТЗ. Таксама Аляксандр Лукашэнка прапанаваў падумаць пра зборачныя вытворчасці велікагрузных кар'ерных самазвалаў, дарожна-будаўнічай і кормаўборачнай тэхнікі. Своеасаблівым сімвалам сустрэчы стала адкрыццё Саборнай мячэці ў Мінску. Тым самым Беларусь яшчэ раз пацвердзіла свой статус талерантнай краіны, адкрытай для людзей розных рэлігій.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук.**

■ Прамая лінія

# Пра сямейны капітал, няпоўны дзень і... крэдыт

**Падчас прамой лініі, якую ў рэдакцыі «Звязды» праводзіла старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна РАМАНОВІЧ, пытанні задавалі людзі не толькі са сталіцы і не толькі па тэме сацыяльнай абароны. Але Жанна Аляксандраўна старалася дапамагчы ўсім або кампетэнтнай інфармацыяй, або парадай.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Добры дзень! Гэта са Светлагорскага раёна вас турбуюць. Мяне завуць Галіна Рыгораўна. Я ўзяла крэдыт у адным з банкаў у 2014 годзе на 18 з паловай мільёнаў рублёў пад 47% на 4 гады. Спраўна плаціла кожны месяц, ужо ўвесь свой доўг аплаціла, а цяпер мне прыйшло паведамленне, што я павінна банку з іншчо 11 мільёнаў рублёў. Як такое можа быць?***

— Галіна Рыгораўна, уся справа ў тым, што вы ўзялі крэдыт пад вялікія працэнты. Чаму не параіліся перад гэтым са сваімі дзецьмі? Яны б вас, хутчэй за ўсё, адгаварылі. Вы, верагодна, спраўна аддавалі банку грошы, якія ў яго пазычылі, але не аддавалі працэнты. Таму і ўзнікла запазычанасць. Тут ужо нічога не зробіш, на жаль, бо вы, калі бралі гэты крэдыт, пагадзіліся з усімі яго ўмовамі.

Але раю ўсё ж звярнуцца ў банк, каб вам падрабязна патлумачылі, чаму вы ім павінны гэтыя грошы. Няхай дадуць падрабязныя раздрукоўкі пагашэння вашага крэдыту за кожны месяц... Яшчэ можаце звярнуцца ў мясцовыя органы па сацыяльнай абароне, каб вам далі сацыяльную дапамогу, раз вы апынуліся ў такой складанай сітуацыі...

**Сацыяльную падтрымку атрымлівае кожны трэці мінчанін.**

***— Якая дадатковая матэрыяльная дапамога аказваецца дзяржавай пры нараджэнні двайнят, куды па яе звяртацца і якія дакументы трэба прадставіць? (Яўгенія, звярнулася па электроннай пошце.)***

— Сем'ям пры нараджэнні двайнят і больш дзяцей даецца дадатковая аднаразовая выплата на набыццё дзіцячых рэчаў першай неабходнасці. Гэтая выплата ажыццяўляецца на кожнага з дзяцей у памеры двухразовай найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва за два апошнія кварталы перад датай нараджэння дзяцей.

У Мінску па такую выплату неабходна звяртацца ва ўпраўленне сацыяльнай абароны адміністрацыі раёна ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання). Выключэнне складаюць Ленінскі і Фрунзенскі раёны, дзе дакументы прымаюцца тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

Пакет дакументаў мінімальны: пашпарт мамы і пасведчанні аб нараджэнні дзяцей.

***— Ці прадугледжаны дзяржавай якія-небудзь ільготы наконт кватэры для інваліда 2 групы? Можа, якое-небудзь сацыяльнае жыллё належыць даваць? Наша сям'я стаіць у чарзе 11 гадоў у выканкаме, у нас не хапае квадратных метраў. Адна дачка інвалід, другая выйшла замуж, і ясць да нас цяпер далучыўся. Месца ўсім не хапае...***

— Наконт ільготнага прадастаўлення жылля вам лепш звярнуцца ва ўпраўленне жыллёвай палітыкі Мінска альбо ў аддзел жыллёвай палітыкі адміністрацыі вашага раёна, вам там дадуць падрабязныя тлумачэнні. Скажыце, а вашай другой дачцэ ёсць 31 год?

***— Ёй 25 гадоў.***

— Тады ёй трэба станавіцца на чаргу як маладой сям'і і чакаць. Альбо шукаць магчымасць неяк купіць жыллё. Якіх-небудзь ільгот для інваліда 2 групы, што тычацца прадастаўлення жылля, няма.

***— Скажыце, ці можна датэрмінова скарыстацца сродкамі сямейнага капіталу для паляпшэння сваіх жыллёвых умоў? (Ала Уладзіміраўна, пытанне зададзена па электроннай пошце.)***

— Ала Уладзіміраўна, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 снежня 2014 года № 572 «Аб дадатковых мерах дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей» устаноўлена 5 кірункаў выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу: гэта паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне адукацыі, атрыманне паслуг у сферы сацыяльнага абслугоўвання і аховы здароўя, фарміраванне назапашвальнай (дадатковай) пенсіі маці (мачахі) у поўнай сям'і, аднаго з бацькоў у няпоўнай сям'і.

**Усяго на ўліку ў органах сацыяльнай абароны горада на 1 жніўня 2016 года было 480 178 атрымальнікаў пенсій — гэта 18,4% ад агульнай колькасці пенсіянераў у краіне.**
**У сталіцы пражываюць 123 048 асоб з інваліднасцю, у тым ліку 3296 інвалідаў-калясачнікаў і 6040 дзяцей-інвалідаў.**

Але права на распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу па ўказаных кірунках прадастаўляецца па заканчэнні 18 гадоў з даты нараджэння дзіцяці, у сувязі з нараджэннем, усынаўленнем (удачарэннем) якога сям'я набыла права на прызначэнне сямейнага капіталу. Што тычыцца магчымасці датэрміновага выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу, то датэрмінова яны могуць расходавацца толькі на медыцынскія мэты — на атрыманне членам (альбо некалькімі членамі) сям'і платных медыцынскіх паслуг, што аказваюць арганізацыямі аховы здароўя, у парадку і па пераліку, што вызначаюцца Міністэрствам аховы здароўя.

***— Добры дзень! Вас турбуе маці 13-гадовага дзіцяці. Ці магу я звярнуцца да кіраўніцтва з просьбай аб устанаўленні няпоўнага рабочага часу? (Аксана Курс, г. Слуцк.)***

— Так, можаце. Няпоўны рабочы час устанаўліваецца па дамоўленасці паміж работнікам і наймальнікам як пры прыёме на працу, так і пасля (арт. 118 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь). Такім чынам, ініцыятыва можа зыходзіць ад любога з іх. У адпаведнасці з п. 1 ч. 2 арт. 289 ПК наймальнік абавязаны ўстанавіць няпоўны працоўны час па просьбе жанчыны, якая мае дзіця ва ўзросце да 14 гадоў.

Магчымы наступныя варыянты няпоўнага працоўнага часу:

— устанаўленне няпоўнага рабочага дня, г.зн. памяншэнне працягласці штодзённай працы;

— устанаўленне няпоўнага рабочага тыдня, г.зн. памяншэнне колькасці рабочых дзён у тыдзень;

— адначасовае памяншэнне працягласці рабочага дня і колькасці рабочых дзён у тыдзень.

Умова аб працы з няпоўным рабочым часам уключаецца ў працоўны дагавор пры прыёме работніка на работу. Пераход на няпоўны рабочы час у перыяд працоўнай дзейнасці — афармляецца загадам (распараджэннем).

Праца работнікаў з няпоўным рабочым часам аплачваецца прапарцыйна адпрацаванаму часу (пры пачасовай форме аплаты) або ў залежнасці ад выпрацоўкі (пры здзельнай форме аплаты).

Пры гэтым праца на ўмовах няпоўнага рабочага часу не цягне для работніка якіх-небудзь абмежаванняў працягласці працоўных адпачынкаў, вылічэння працоўнага стажу і іншых працоўных правоў. Звесткі аб няпоўным рабочым часе ў працоўную кніжку работніка не заносяцца.

***— Добры дзень! Гэта Інга Макарава з Мінска тэлефануе. У нас такая сітуацыя: у сям'і двое дзяцей, старэйшай дачцэ 5 снежня споўніцца 18 гадоў, малодшай зараз 2 гады. Ці зменіцца для нас памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў?***

— Так, памер дапамогі зменіцца. Да 5 снежня памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у адпаведнасці з артыкулам 13 Закона Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 г. № 7-З «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» у вас складае 40% сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у рэспубліцы (як на другога і наступных дзяцей), а з 6 снежня — складзе ўжо 35% сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у рэспубліцы (як на першае дзіця).

***— Дзякуй за адказ!***

— Усяго добрага вам і вашым дзеткам!

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ За падзеяй

# ЖЫЦЬ ПОБАЧ І Ў МІРЫ

## У саборнай мячэці прэзентавана кніга Уладзіміра Ліхадзедава «Беларусь і мусульманскі свет»

**Здаўна на Беларусі храмы з'яўляюцца не толькі рэлігійнымі, але і культурнымі, асветніцкімі цэнтрамі. Тут заўсёды віталася кніжнасць, павага да каранёў. Вось і новая саборная мячэць у сталіцы ў самы першы дзень работы сабрала не толькі вернікаў-мусульман на супольную малітву, але і інтэлектуалаў. Даследчыкі, кіраўнікі мусульманскіх абшчын з Беларусі, Расіі і Казахстана за «круглым сталом» абмяркоўвалі шырокую і грунтоўную тэму «Дыялог рэлігій і культур у святле сучасных тэндэнцый развіцця ісламу і выклікаў сённяшняга дня».**


Фота Надзеі БУЖАН.
**Даследчык, калекцыянер Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ падчас прэзентацыі.**

Падчас сустрэчы быў прэзентаваны дакументальны фільм «Міралюбівая рэлігія — іслам», а даследчык і калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў прадставіў выстаўку старых фотаздымкаў і кнігу «Беларусь і мусульманскі свет».

— У Беларусі пражывае 100—120 тысяч мусульман, — кажа **муфцій Беларусі Абу-Бекір ШАБАНОВІЧ**. — Існуе меркаванне, што мова — аснова нацыі, няма мовы — няма і нацыі. Але гістарычна склалася так, што татары-мусульмане на Беларусі захавалі сваю ідэнтычнасць менавіта дзякуючы рэлігіі. Нашы продкі, якія жылі тут цягам больш як шасці стагоддзяў, страцілі мову яшчэ ў пачатку XV стагоддзя, праз два пакаленні. Можна сцвярджаць, нас захавала рэлігія, духоўнасць, гэта асноўны складнік, што падтрымліваў нашу ідэнтычнасць і адметнасць.

У Беларусі сёння існуе 26 мусульманскіх абшчын, працуе 12 мячэцяў. Пра гісторыю мусульманскай супольнасці ў нашай краіне можна даведацца са старонак кнігі Уладзіміра Ліхадзедава «Беларусь і мусульманскі свет». У мячэці, пабудаванай у сталіцы, адкрылася і аднайменная выстаўка фотаздымкаў. На старых выявах — мусульманскія храмы ў Іўі і Слоніме, Навагрудку і Мінску, на Смаргоншчыне і ў Клецку, многія з іх не захаваліся да нашых дзён. Муфцій адзначыў:

— Кніга Уладзіміра Ліхадзедава «Беларусь і мусульманскі свет» стала выдатным падарункам першым асобам арабскіх дзяржаў падчас афіцыйных візітаў Прэзідэнта Беларусі. Яна была прэзентавана ў бібліятэцы Кангрэса ЗША і атрымала высокую ацэнку. Выданне на рускай, англійскай, турэцкай мовах расказвае пра гісторыю татарскіх паселішчаў на Беларусі з XIV — XV стагоддзяў і да сённяшняга дня.

— Нашы землі заўсёды вызначаліся талерантнасцю і цярпімасцю да розных веравызнанняў. Тут мірна жылі хрысціяне, іўдзеі, мусульмане, усе лічылі Беларусь сваёй радзімай, — кажа **даследчык Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ**. — У кнізе «Беларусь і мусульманскі свет» можна пабачыць унікальныя фотаздымкі, сабраныя ў розных краінах. Кожнаму з іх — больш як 100 гадоў. Я знайшоў і сапраўды ўнікат — фотаздымак з выявай адзінага мусульманіна, які жыў у Полацку ў пачатку XX стагоддзя. У цэлым, вывучэнне ісламскага свету ў Беларусі — вельмі складаная тэма, мала захавалася архіўных матэрыялаў, фотаздымкаў. Над кнігай працаваў вельмі доўга, але, мне падаецца, атрымалася сабраць сапраўды ўнікальныя выявы.

Уладзімір Ліхадзедаў расказаў, што сувязі Беларусі з мусульманскім светам ахопліваюць больш як 6 стагоддзяў гісторыі. Гэта пацвярджаюць знаходкі арабскіх манет, што датуюцца VII — VIII стагоддзямі. Але ў гэтай тэме ёсць яшчэ «белыя плямы». Так, не цалкам вывучаны гандлёвы шлях па Дзвіне ў Волгу, менавіта па ім нашы продкі гандлявалі з мусульманскім светам. Даследаванні працягваюцца, таму, думаецца, нас чакаюць новыя знаходкі і адкрыцці.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# ЖЫЛЛЁ З МЕДЫЦЫНСКІМ КАМФОРТАМ

**Новы 4-павярховы жылы корпус з убудаваным медыцынскім блокам з'явіўся на тэрыторыі Чавускага псіханеўралагічнага дома-інтэрната. Ён цалкам забяспечыць патрэбу ў жылплошчы ўсіх тых 116 чалавек, якія сёння стаяць у вобласці на чарзе.**

Як адзначыў падчас яго адкрыцця старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір Даманеўскі, у краіне ўдзяляецца вялікая ўвага сацыяльнай абароне чалавека. І адкрыццё новага корпуса пацвярджэнне таму. У якасці падарунка ён перадаў установе стаматалагічнае абсталяванне. Яшчэ адзін карысны падарунак — бегавую дарожку — падарыла дому-інтэрната намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Марыяна Шчоткіна. Яна падкрэсліла ў сваёй прамове, што адкрыццё новага корпуса забяспечыць якаснае і комплекснае аказанне сацыяльных паслуг усім, хто там жыве.

Прыемна, што корпус з медблокам цалкам забяспечаны мэбляй і ўсім неабходным абсталяваннем. Да паслуг пацыентаў вялікі фізіятэрапеўтычны кабінет, кабінет лячэбнай фізкультуры, фізіка-хімічная лабараторыя, кабінет стаматолага, працэдурны і перавязачны кабінеты. «Адкрыццё медблока дапамагло нам вырашыць праблему з медыцынскім абслугоўваннем пацыентаў і не вазіць іх, як гэта было раней, у раённую бальніцу, — паведаміла дырэктар дома-інтэрната Таццяна Ваяводава. — А ўвядзенне ў строй 4-га жылога корпуса дапамажа палепшыць жылёвыя ўмовы нашым былым пастаяльцам (іх тут 192) і даць жыллё больш як ста новым». Акрамя таго, для абслугоўвання новага корпуса спатрэбіцца 65 працоўных месцаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


Фота БЕЛТА.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе

# ПО ПРОДАЖЕ АПАРТАМЕНТОВ И ГАРАЖНЫХ БОКСОВ в г. СОЧИ,

## находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления

| № лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, росс. руб. | Задаток, росс. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Апартамент № 001 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 101,2 кв.м | 12 710 276,00 | 1 271 027,60 |
| Лот № 2 | Апартамент № 002 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 59,7 кв.м | 7 977 119,00 | 797 711,90 |
| Лот № 3 | Апартамент № 003 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 61,2 кв.м | 8 177 011,00 | 817 701,10 |
| Лот № 4 | Апартамент № 004 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1619 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 99,6 кв.м | 14 429 347,00 | 1 442 934,70 |
| Лот № 5 | Апартамент № 101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 1. Площадь – 101,7 кв.м | 13 785 409,00 | 1 378 540,90 |
| Лот № 6 | Апартамент № 104 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 1. Площадь – 100,8 кв.м | 13 664 046,00 | 1 366 404,60 |
| Лот № 7 | Апартамент № 201 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1528. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,4 кв.м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот № 8 | Апартамент № 202 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1529. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 170,9 кв.м | 22 739 143,00 | 2 273 914,30 |
| Лот № 9 | Апартамент № 203 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1546. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 103,1 кв.м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот № 10 | Апартамент № 204 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1547. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 69,4 кв.м | 10 752 762,00 | 1 075 276,20 |
| Лот № 11 | Апартамент № 205 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1530. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 116,7 кв.м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот № 12 | Апартамент № 206 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1531. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 98,7 кв.м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот № 13 | Апартамент № 208 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1533. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,9 кв.м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот № 14 | Апартамент № 209 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1534 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 60,6 кв.м | 10 135 952,00 | 1 013 595,20 |
| Лот № 15 | Апартамент № 210 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1535. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 97,7 кв.м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот № 16 | Апартамент № 211 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1527. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь –123,3 кв.м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот № 17 | Апартамент № 301 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1630. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,4 кв.м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот № 18 | Апартамент № 302 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1636. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 170,9 кв.м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 19 | Апартамент № 303 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1634. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 103,1 кв.м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот № 20 | Апартамент № 305 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв.м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот № 21 | Апартамент № 306 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв.м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот № 22 | Апартамент № 308 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв.м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот № 23 | Апартамент № 309 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв.м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот № 24 | Апартамент № 310 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1538. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 97,7 кв.м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот № 25 | Апартамент № 311 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1541. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 123,3 кв.м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот № 26 | Апартамент № 401 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1540. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,4 кв.м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот № 27 | Апартамент № 402 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1536. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 170,9 кв.м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 28 | Апартамент № 403 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1537. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 103,1 кв.м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот № 29 | Апартамент № 404 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1549. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 69,4 кв.м | 11 108 284,00 | 1 110 828,40 |
| Лот № 30 | Апартамент № 405 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1550. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 116,7 кв.м | 18 457 171,00 | 1 845 717, 10 |
| Лот № 31 | Апартамент № 408 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1568. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,9 кв.м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот № 32 | Апартамент № 409 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1569. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 60,6 кв.м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот № 33 | Апартамент № 410 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1570. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 97,7 кв.м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот № 34 | Апартамент № 411 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1572. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 123,3 кв.м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот № 35 | Апартамент № 501 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1564. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,4 кв.м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот № 36 | Апартамент № 502 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1565. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 170,9 кв.м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 37 | Апартамент № 503 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1578. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 103,1 кв.м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот № 38 | Апартамент № 509 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1553. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 60,6 кв.м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот № 39 | Апартамент № 510 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1567. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 97,7 кв.м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот № 40 | Апартамент № 511 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1571. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 123,3 кв.м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот № 41 | Апартамент № 601 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1573. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,4 кв.м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот № 42 | Апартамент № 602 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1576. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 170,9 кв.м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 43 | Апартамент № 608 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1557. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,9 кв.м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот № 44 | Апартамент № 609 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1587. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 60,6 кв.м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот № 45 | Апартамент № 610 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1558. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 97,7 кв.м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот № 46 | Апартамент № 611 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1594. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 123,3 кв.м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот № 47 | Апартамент № 701 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1595. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 172,4 кв.м | 25 242 076,00 | 2 524 207, 60 |
| Лот № 48 | Апартамент № 702 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1583. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 170,9 кв.м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 49 | Апартамент № 703 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1566. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 103,1 кв.м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот № 50 | Апартамент № 710 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1580. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 97,7 кв.м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот № 51 | Апартамент № 711 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1575. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 123,3 кв.м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот № 52 | Апартамент № 801 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1574. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 172,4 кв.м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот № 53 | Апартамент № 802 (3- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1600. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 170,9 кв.м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 54 | Апартамент № 803 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1591. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 103,1 кв.м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот № 55 | Апартамент № 809 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1590. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 60,6 кв.м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот № 56 | Апартамент № 810 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1610. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 97,7 кв.м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот № 57 | Апартамент № 811 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1611. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 123,3 кв.м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот № 58 | Апартамент № 901 (3- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1612. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 172,4 кв.м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот № 59 | Апартамент № 902 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1638. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 170,9 кв.м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 60 | Апартамент № 904 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1643. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 69,4 кв.м | 11 108 284,00 | 1 110 828,40 |
| Лот № 61 | Апартамент № 905 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1639. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 116,7 кв.м | 18 457 171,00 | 1 845 717,10 |
| Лот № 62 | Апартамент № 1002 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1651. Назначение – нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 344,0 кв.м | 50 614 082,00 | 5 061 408,20 |
| Лот № 63 | Апартамент № 1003 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1663. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 103,1 кв.м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот № 64 | Апартамент № 1009 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1670. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 60,6 кв.м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот № 65 | Апартамент № 1010 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1672. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 97,7 кв.м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот № 66 | Апартамент № 1011 (4-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1646. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 247,4 кв.м | 36 400 333,00 | 3 640 033,30 |
| Лот № 67 | Апартамент № 1101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1647. Назначение – нежилое. Этаж – 11. Площадь – 108,3 кв.м | 17 127 889,00 | 1 712 788,90 |
| Лот № 68 | Гаражный бокс № 1 с кадастровым номером 23:49:0203004:1649. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 14,9 кв.м | 1 344 988,00 | 134 498,80 |
| Лот № 69 | Гаражный бокс № 2 с кадастровым номером 23:49:0203004:1673. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 14,5 кв.м | 1 342 132,00 | 134 213,20 |
| Лот № 70 | Гаражный бокс № 3 с кадастровым номером 23:49:0203004:1618. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 14,0 кв.м | 1 337 849,00 | 133 784,90 |
| Лот № 71 | Гаражный бокс № 4 с кадастровым номером 23:49:0203004:1650. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,7 кв.м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот № 72 | Гаражный бокс № 5 с кадастровым номером 23:49:0203004:1652. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,9 кв.м | 1 337 849,00 | 133 784,90 |
| Лот № 73 | Гаражный бокс № 6 с кадастровым номером 23:49:0203004:1654. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,7 кв.м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот № 74 | Гаражный бокс № 7 с кадастровым номером 23:49:0203004:1596. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,2 кв.м | 1 332 137,00 | 133 213,70 |
| Лот № 75 | Гаражный бокс № 8 с кадастровым номером 23:49:0203004:1601. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,8 кв.м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот № 76 | Гаражный бокс № 9 с кадастровым номером 23:49:0203004:1602. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 14,7 кв.м | 1 343 560,00 | 134 356,00 |
| Лот № 77 | Гаражный бокс № 10 с кадастровым номером 23:49:0203004:1603. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,7 кв.м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот № 78 | Гаражный бокс № 11 с кадастровым номером 23:49:0203004:1607. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,4 кв.м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот № 79 | Гаражный бокс № 12 с кадастровым номером 23:49:0203004:1598. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 11,3 кв.м | 1 316 432,00 | 131 643,20 |
| Лот № 80 | Гаражный бокс № 13 с кадастровым номером 23:49:0203004:1604. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 14,9 кв.м | 1 344 988,00 | 134 498,80 |
| Лот № 81 | Гаражный бокс № 14 с кадастровым номером 23:49:0203004:1605. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,5 кв.м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот № 82 | Гаражный бокс № 15 с кадастровым номером 23:49:0203004:1608. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,5 кв.м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот № 83 | Гаражный бокс № 16 с кадастровым номером 23:49:0203004:1606. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,1 кв.м | 1 330 710,00 | 133 071,00 |
| Лот № 84 | Гаражный бокс № 17 с кадастровым номером 23:49:0203004:1614. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 11,7 кв.м | 1 319 287,00 | 131 928,70 |
| Лот № 85 | Гаражный бокс № 18 с кадастровым номером 23:49:0203004:1609. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,5 кв.м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот № 86 | Гаражный бокс № 19 с кадастровым номером 23:49:0203004:1617. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,1 кв.м | 1 322 143,00 | 132 214,30 |
| Лот № 87 | Гаражный бокс № 20 с кадастровым номером 23:49:0203004:1562. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,0 кв.м | 1 329 282,00 | 132 928,20 |
| Лот № 88 | Гаражный бокс № 21 с кадастровым номером 23:49:0203004:1561. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,5 кв.м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот № 89 | Гаражный бокс № 22 с кадастровым номером 23:49:0203004:1563. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,0 кв.м | 1 329 282,00 | 132 928,20 |
| Лот № 90 | Гаражный бокс № 23 с кадастровым номером 23:49:0203004:1653. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 14,3 кв.м | 1 340 704,00 | 134 070,40 |
| Лот № 91 | Гаражный бокс № 24 с кадастровым номером 23:49:0203004:1676. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 15,9 кв.м | 1 353 554,00 | 135 355,40 |
| Лот № 92 | Гаражный бокс № 25 с кадастровым номером 23:49:0203004:1655. Назначение – нежилое Этаж – Подвал №-3.. Площадь – 12,4 кв.м | 1 324 998,00 | 132 499,80 |
| Лот № 93 | Гаражный бокс № 26 с кадастровым номером 23:49:0203004:1656. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,8 кв.м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот № 94 | Гаражный бокс № 27 с кадастровым номером 23:49:0203004:1677. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 12,1 кв.м | 1 322 143,00 | 132 214,30 |
| Лот № 95 | Гаражный бокс № 28 с кадастровым номером 23:49:0203004:1678. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,7 кв.м | 1 334 993,00 | 133 499,30 |
| Лот № 96 | Гаражный бокс № 29 с кадастровым номером 23:49:0203004:1679. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,7 кв.м | 1 334 993,00 | 133 499,30 |
| Лот № 97 | Гаражный бокс № 30 с кадастровым номером 23:49:0203004:1680. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,4 кв.м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот № 98 | Гаражный бокс № 31 с кадастровым номером 23:49:0203004:1681. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,0 кв.м | 1 329 282,00 | 132 928,20 |
| Лот № 99 | Гаражный бокс № 32 с кадастровым номером 23:49:0203004:1675. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №-3. Площадь – 13,5 кв.м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот № 100 | Гаражный бокс № 43 с кадастровым номером 23:49:0203004:1667. Назначение – нежилое. Цокольный этаж № -2. Площадь – 11,7 кв.м | 1 359 266,00 | 135 926,60 |
| Лот № 101 | Гаражный бокс № 45 с кадастровым номером 23:49:0203004:1631. Назначение – нежилое. Цокольный этаж № -2. Площадь – 12,5 кв.м | 1 364 977,00 | 136 497,70 |
| Лот № 102 | Гаражный бокс № 46 с кадастровым номером 23:49:0203004:1627. Назначение – нежилое. Цокольный этаж № -2. Площадь – 13,5 кв.м | 1 373 544,00 | 137 354,40 |

### ОПИСАНИЕ АПАРТОТЕЛЯ

Апартаменты и гаражные боксы находятся в здании апартотеля, представляющего собой монолитное 13-этажное здание (введено в эксплуатацию в апреле 2015 г.), расположенного по адресу: г. Сочи, ул. Политехническая, д. 62, в одном из самых экологически чистых районов, на круглосуточно охраняемой территории Государственного учреждения «Санаторий «Беларусь» в непосредственной близости от государственной дачи «Бочаров ручей». Апартотель расположен на земельном участке с кадастровым № 23:49:0203004:21 площадью 155 600 кв.м, предоставленном Государственному учреждению «Санаторий «Беларусь» на праве аренды по 22.09.2062. Разрешенное использование земельного участка – для размещения и эксплуатации зданий и сооружений санатория.

### УСЛОВИЯ

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по 23.11.2016 г. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.

Валюта торгов – российский рубль. Валюта платежа — российский рубль.

Задаток за участие в аукционных торгах устанавливается в российских рублях. Сумма для оплаты задатка на участие в аукционе для резидентов Республики Беларусь производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать договор купли-продажи Объекта (Объектов) с Продавцом в течение 5 (пяти) дней с назначенной даты аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты аукциона.

Передача Победителю аукциона (Претенденту на покупку) пакета документов для регистрации (оформления) права собственности осуществляется только после оплаты полной стоимости Объекта (Объектов).

Государственная регистрация договора купли-продажи Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) после полной оплаты стоимости приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) и получения перечисленной суммы Продавцом.

Все расходы по удостоверению, составлению и оформлению договора купли-продажи, уплате государственной пошлины оплачиваются Победителем аукциона (Претендентом на покупку).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счет-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Запрет на изменение фасадной части.

Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 5% от стоимости Объекта (Объектов).

**Аукцион состоится 30.11.2016 г. в 10.00 по мск по адресу: Российская Федерация, Краснодарский край, г. Сочи, ул. Политехническая, 62, конгресс-зал главного корпуса. Шаг аукциона – 5%.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.

Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях 3012232138035, код 739, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов (Лот №__), **проводимом 30 ноября 2016 г.**

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки – в соответствии с законодательством Российской Федерации.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются:

- в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 6 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений **23.11.2016 до 16.00 по белорусскому времени;**
- в г. Сочи, ул. Политехническая, 62, юридический отдел в здании главного корпуса: **29.11.2016 г. с 09.00 до 11.00 по мск.** Для этого потенциальному участнику необходимо **не позднее 23.11.2016 г.** по средствам электронной почты и (или) факсимильной связи обратиться к Организатору аукциона с заявлением с просьбой о проведении процедуры регистрации в качестве участника аукциона в г. Сочи и предоставить копию платежного документа о перечислении задатка.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Кришеник Сергей Иванович: 8-10-7-862-259-60-02, 8-10-7-862-259-60-12, 8-10-7-928-451-31-69.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

■ Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

**Пералум'е Жабінкаўскага раёна**

# «ДЗЕНЬ, КАЛІ ПРЫВОЗЯЦЬ ПЕНСІЮ, МЫ НАЗЫВАЕМ ДНЁМ ВЁСКІ»

**Як і ў многія іншыя маленькія вёскі, у Пералум'е давялося ехаць па лясной гравійцы. На ўзбочыне дарогі стаяў пусты аўтобус. Старшыня сельскага Савета Ларыса Харс выказала здагадку, што людзі пайшлі ўглыб лесу ў грыбы. 9 лістапада, калі большасць паселішчаў краіны былі пад снегам, на поўдні Брэстчыны збіралі зялёнкі...**



Любоў КУЗЬМІЧ — староста Пералум'я.

Але праз некалькі кіламетраў лес скончыўся і дарога плаўна перайшла ў вясковую вуліцу. Едзем, а старшыня, нібы экскурсавод, расказвае пра кожны дом абапал дарогі: «Вось гэты прадаецца, гэты таксама без гаспадароў, гэты выкарыстоўваецца летам пад дачу, суседні таксама, і ў гэты прыязджаюць гарадскія дзеці з унукамі, а гэты, з забітымі вокнамі, мае асобную гісторыю».

Маю ўвагу прыцягнуў дом, кожнае з акон якога ўпоперак перагароджвалі дзве дошкі. Аказалася, што хата даўно выкуплена мясцовым калгасам, яе выкарыстоўвалі ў якасці службовага жылля для работнікаў. Апошнім часам і яна засталася без гаспадароў. І вось аднойчы нейкі прыезджы невядома адкуль злаздюжка аблюбаваў сабе нічыйны дом у якасці прыстанішча. Днём ён выходзіў на промысел, стараўся нешта ўкрасці з іншых дамоў, а начаваць вяртаўся ў свой «гатэль». Калі яго вылічылі праваахоўнікі і затрымалі, уласнікі дома — работнікі сельгаспрадпрыемства — ад граху падалей забілі вокны, бо няпрошаны госць трапіў у хату менавіта праз адцісную шыбу акна.

Такім чынам, няцяжка аказалася ўпэўніцца, што большасць дамоў з некалі немалой вёскі Пералум'е стаяць пустыя. У ранейшыя часы тут знаходзілася буйная жывёлагадоўчая ферма.

— Была работа для людзей, і жыхароў было болей, — расказвае Любоў Пятроўна Кузьміч, — цяпер вось засталёмся мы, апошнія з магікан.

Любоў Пятроўна нарадзілася пасля вайны, але гісторыю вясковай трагедыі добра ведае. «Лес вакол, партызаны стаялі, гэты факт не маглі пакінуць без увагі немцы, і ў 1942 годзе палову вёскі спалілі.

— У маіх бацькоў было васьмёра дзяцей, на той час шацёра, — працягвае жанчына. — Уяўляеце, як гэта — застацца без даху над галавой? Намучыліся, націрпеліся. Жылі ў сваякоў, пакуль тыя трымалі. Потым, маці расказвала, зрабілі хатку з саломы, у ёй жылі. І ўжо ў 1947 годзе узвялі вось гэтую хату — паказвае рукой гаспадыня на прасторную кухню, у якой мы і сядзім за сталом. — Старэйшы брат, 1926 года нараджэння, яшчэ паспеў паваяваць, а я нарадзілася ўжо ў гэтым, новым доме. Пасля школы, як і многія, з'ехала ў горад. Я падалася ў Мінск, знайшла добрую работу, уладкавалася ў адным з навуковадаследчых інстытутаў. Жыццё ў сталіцы мне вельмі падабалася, здавалася, што там быў мой лёс. Але ведаеце, як гэта здараецца ў жыцці... Дзяцей у мамы было многа, а калі яна захварэла, то даглядаць давялося мне. Таму я рассталася з Мінскам і пераехала ў вёску, як аказалася, назаўсёды.

Каб болей часу знаходзіцца каля хворай маці, Любе давялося запісацца ў калгасныя паляводы. Работа была розная: і бульбу перабіраць, і буракі палоць, і на складзе мінеральныя ўгнаенні перагружаць. Так і дапрацавала да пенсіі.

Тым часам да нашай размовы далучаецца гаспадар дома Валянцін Іванавіч. Пасля пераезду з Мінска ён працаваў жывёлаводам. Кажа, што ферма тут была на 400 галоў, але бывала ў калгасным статку і да шасці соцень жывёлін. Пашы за лесам былі проста шыкоўныя, жывёла добра наядалася, пра што сведчылі і прыбаўленні ў вазе, і надоі. Потым землі згубілі распрацоўкі торфазавода, і цяпер яны, тыя землі, прапашчыя. Няма болей фермы, няма паляводчай брыгады, якая налічвала да 40 чалавек, і пра той час былы жывёлавод гаворыць з настальгіяй. Як і няма ніякай іншай работы ў акрузе. Праўда, у Пералум'і набыла дом сям'я з Брэста. Муж і жонка зарэгістравалі фермерскую гаспадарку. Галава сям'і памёр, справу прадоўжыла жонка, яна вырошчвае буякі. Паводле слоў вяскоўцаў, фермеры — надта добрыя людзі. Даюць падпрацаваць і зарабіць капейку усім суседзям, хто жадае і мае сілы. Але ж ягады сабралі, сезон закрылі і з'ехалі. І зноў цішыня.

Пастаяннымі жыхарамі Пералум'я з'яўляюцца сем чалавек, якія зарэгістраваныя ў вёсцы, усе яны пенсіянеры. А Любоў Пятроўна ў іх староста. Стасункі апошніх жыхароў Пералум'я са знешнім светам найлепш ажыццяўляюцца з дапамогай гандлёвых арганізацый. Два разы на тыдзень у вёску заязджае аўтакрама гандлёвай фірмы і раз на тыдзень машына райспажыўсаюза. Серада — дзень прыезду фірмовай аўтакрамы, і мы са старшынёй сельсавета з цікавасцю вывучылі асартымент перасоўнага магазіна. Варта адзначыць, што ён даволі прыстойны. А вось пакупнікоў каля машыны аказалася толькі двое...

Яшчэ не было паштовай машыны, якая прывозіць пенсію, — патлумачылі нам. Пошту чакалі менавіта ў гэты дзень. «Дзень атрымання пенсіі мы называем днём альбо святам вёскі», — пажартавала Любоў Пятроўна. Ну яно і зразумела, у гаспадыні дома гасцілі сын з нявесткай і ўнучкай. Відома, прыемна ўсім накупіць гасцінцаў. Хоць галоўная падтрымка маладой сям'і заключаецца не ў магазінных прысмаках, а ў харчовай дапамозе, вырашчанай на ўласным падворку. Гаспадары трымаюць курэй ды свіней. Таму кавалак экалагічна чыстага мяса да стала заўсёды гарантаваны. Праўда, непакоіцца аб адным, каб не вярнуліся зноў да 5-кіламетровай зоны ў справе забароны вырошчвання свіней. Літаральна два гады таму каля суседняй вёскі Сычова ўзвялі свой комплекс. Цяпер, як вядома, нормы санітарнага кардону складаюць два кіламетры. Але перыядычна ўзнікаюць размовы пра пашырэнне...

— Хоць ногі ды спіна не вельмі здаровыя, — гаворыць Любоў Кузьміч, — каб дабрацца за 300—400 метраў да аўтакрамы, бяру веласіпед, але гаспадарку сякую-такую трымаем. У малодшага сына нядаўна жонка ў райцэнтры без работы засталася. Пакуль знойдзе тую работу, дапамагаць трэба. А старэйшы сын — інвалід з дзяцінства, з намі жыве. У школу ён не хадзіў, а чытаць навучыўся па газеце «Звязда». Помню, першая яго літара была «З». Шмат гадоў мы выпісвалі беларускае выданне, усёй сям'ёй чыталі.

Вось так прыемна бывае ў самай глыбінцы сустрэць нашых чытачоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*yackevich@zviazda.by*

---

«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця музея «Вайна пад стрэхамі», прысвечанага Алесю Адамовічу і яго творчасці, у пасёлку Глуша Бабруйскага раёна.

Андрэй КУНЦЭВІЧ:

## «МУЗЕЙ — СПРАВА АГУЛЬНАЯ»

**Сёлета пры Бабруйскім райвыканкаме быў адкрыты разліковы рахунак на збор сродкаў для выпрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей Алеся Адамовіча. І першым, хто пералічыў на яго грошы, было галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама. Пра тое, што рабіцца ў вобласці для таго, каб музей пісьменніка з'явіўся, — у нашай размове з начальнікам гэтага ўпраўлення Андрэем КУНЦЭВІЧАМ.**

— Ідэя стварэння музея нашага славутага земляка абмяркоўваецца даўно. Таму сімвалічна, што менавіта ў Год культуры прынята канчатковае рашэнне зрабіць у Глушы музей, прысвечаны гэтаму геніяльнаму пісьменніку. Рахунак створаны, мы выкарыстоўваем любую нагоду, каб давесці да людзей інфармацыю на гэты конт. На сайтах Магілёўскага аблвыканкама і Бабруйскага райвыканкама размешчаны банеры з заклікам падтрымаць агульную справу.

**— Наколькі актыўна адгукаюцца на прапанову папоўніць рахунак? Хто яго асноўны ўкладчык?**

— Адразу ж пасля адкрыцця разліковага рахунку работнікі культуры Магілёўскай вобласці рэалізавалі некалькі ініцыятыў з мэтай папоўніць агульную скарбонку. Пэўную суму пералічыла на яго Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Бабруйскага раёна. Сюды ж накіраваны ўсе сродкі ад рэалізацыі білетаў на канцэрт творчых калектываў Бабруйскага раёна, які адбыўся ў рамках фестывалю «Народныя таленты Магілёўшчыны». Такія ініцыятывы, я ўпэўнены, будуць рэалізоўвацца і далей. У вобласці шмат чаго робіцца для прапаганды спадчыны славутых ураджэнцаў. Неўзабаве ўбачыць свет альбом «Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадруку». Нядаўна ў Магілёве ўспаміналі творчасць вядомага нашага земляка кінарэжысёра Віктара Турава, у кінатэатрах ішлі паказы яго фільмаў, адбываліся творчыя сустрэчы. Дарэчы, менавіта Віктар Тураў экранізаваў знакамітую дылогію Алеся Адамовіча «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой». Разам з Магілёўскім кінавідэапракатам мы абгаворым магчымасць правядзення тыдня фільмаў па творах Алеся Адамовіча. Актыўна прапагандуе творчасць пісьменніка абласная бібліятэка імя Леніна. У наступным годзе мы будзем адзначаць 90-годдзе юбілей пісьменніка, і там рыхтуецца шэраг звязаных з гэтай датай мерапрыемстваў.

**— На сённяшні дзень на стварэнне музея сабрана ўсяго каля 900 рублёў новымі грашыма. Калі справа і далей так пойдзе, то яго адкрыццё можа зацягнуцца на гады.**

— З самага пачатку гэты праект быў заяўлены, як прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Грамадства таксама павінна паказаць, што зацікаўлена ў стварэнні гэтага музея. У свой час было шмат размоў вакол адкрыцця разліковага рахунку. Маўляў, вы толькі адкрыйце — і спонсары знойдуцца. Аднак, калі з'явіўся шанц на справе здзейсніць свае абяцанні, некаторыя «ініцыятары» паспяшаліся сысці ў цень. У гэтай справе не мае значэння, хто колькі пералічыў грошай. Галоўнае, не застацца ўбаку. Зараз ёсць рэальная магчымасць даказаць, што гэты музей усім нам патрэбны.

**— Магчыма, справе перашкаджае тое, што няма так званага назіральнага савета? Ці магчыма стварэнне яго пры галоўным упраўленні ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама?**

— Тое, што такі грамадскі орган патрэбны, лічу добрай ідэяй, але наўрад ці ён павінен быць пры нашым упраўленні. Мы гатовы дэлегаваць у гэты савет свайго супрацоўніка. Я таксама буду дапамагаць савету, удзельнічаць у яго рабоце.

**— На думку спецыялістаў, на праектна-каштарысную дакументацыю спатрэбіцца каля 12 000 сучасных рублёў. Што будзе зроблена, калі гэта сума акумулюецца на рахунку?**

— Як толькі гэтыя сродкі паступяць на разліковы рахунак, Бабруйскі райвыканкам будзе мець усе падставы, каб аб'явіць конкурс на правядзенне гэтых работ. Напэўна, распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі і будзе той самай першай канкрэтнай справай, вакол якой згуртуюцца ўсе тыя, хто зацікаўлены ў стварэнні музея.

Святлана АЛЕКСІЕВІЧ:

## «ЁН НЕ ВУЧЫЎ МЯНЕ ПІСАЦЬ, ЁН ВУЧЫЎ МЫСЛІЦЬ»

Нобелеўская лаўрэатка матэрыяльна падтрымала ідэю аб стварэнні музея

**Сусветна вядомая пісьменніца рэдка бывае дома. Цяпер яна зноў працягвае свой тур па замежных краінах. Але перад сваёй паездкай у Германію Святлана АЛЕКСІЕВІЧ не адмовіла карэспандэнту «Звязды» пагутарыць на тэму стварэння музея. А заадно падзялілася сваімі ўспамінамі пра Алеся Адамовіча.**

— Я ведаю, што існуе мэта стварыць музей, і я падтрымліваю гэтую ідэю, — кажа яна. — У мяне быў цяжкі год, шмат паездак, але я заўсёды трымала ў свядомасці, што павінна ў гэтым удзельнічаць. Я ахвярую пяць тысяч долараў, ва ўсякім разе хоць пачнецца будаўнічая работа. Калі б кожны з нас, у каго грошай болей, чым у іншых, мог нешта зрабіць для памяці вялікага пісьменніка, мы б жылі зусім інакш. Мы чакаем нейкіх патурanняў дзяржавы, а дзе мы? Чаму мы нічога не робім самі? Гэтаму нам трэба вучыцца ў той жа Еўропы. Там, напрыклад, у месцы, дзе жыў пісьменнік, нават малавядомы, абавязкова адкрываюць музей і паставяць яму помнік. Там усё робіцца для захавання яго памяці, і нават у школах пра гэта гавораць. Ёсць такая культурная пераемнасць. Мы ж недаацэньваем, што такое памяць, што такое вялікі чалавек у нашай культуры.

Але нягледзячы на тое, што мы жывём у такі прамежкавы час, калі планка культурнага жыцця знізілася і ўсю прастору запоўніла матэрыяльная частка, калі людзі занятыя выжываннем, нейкімі матэрыяльнымі рэчамі, усё роўна трэба заставацца людзьмі, трэба назапашваць, як той казаў, айсберг культуры. Жыццё складаецца не толькі з матэрыяльных рэчаў, чалавекам чалавека робіць культура. Трэба чытаць эсэ Адамовіча, яго артыкулы, каб «пашырыць мазгі».

Патрэбны нейкі спіч да багатых людзей. Сёння яны наб'юць кішэні, а іх дзеці, нават калі паедуць вучыцца ў іншую краіну, усё роўна застануцца грамадзянамі гэтай краіны. Таму трэба думаць пра радзіму. Хоць бы адну-дзве справы зрабіце не толькі для сябе, але і для краіны.

**— Наколькі вам блізкая тэма Адамовіча і наогул гэты пісьменнік?**

— Адамовіч — гэта мой настаўнік. На маю думку, Адамовіч — самы інтэлектуальны чалавек у нашай літаратуры, ва ўсялякім разе я вельмі рада, што ён паставіў мне, вобразна кажучы, машыну мыслення, у яго я вучылася шматлікім рэчам.

**— А якім вы запомнілі Адамовіча? Можа, узгадаеце нейкі эпізод?**

— Алесь Адамовіч быў дзіўны чалавек. Мы пазнаёміліся, калі выйшла кніга «Я з вогненнай вёскі». Я якраз працавала ў «Сельскай газеце», і мне далі заданне зрабіць з ім інтэрв'ю. Я патэлефанавала дамовіцца аб сустрэчы і зусім нечакана пачула: добра, я да вас забягу. А я думала, што ён, такі мэтр, запросіць кудысьці прыйсці. Ён сапраўды забег у рэдакцыю пасля абеду, і мы з ім пагутарылі. Праз некаторы час перадала яму інтэрв'ю, ён прачытаў і прызнаўся: «Я калі ўбачыў вас, такую маленькую, падумаў: ну што гэта дзяўчынка напіша? Вазьму ўсё і перапішу». Але інтэрв'ю яму спадабалася. З тых часоў мы сталі сябраваць. Гэта былі ўрокі духоўныя. Ён не вучыў мяне пісаць, ён вучыў мяне мысліць. Гэты чалавек вельмі паўплываў на мяне.

**— І які ўрок быў самым важным?**

— Духоўная асоба складаецца з агульнага поля, агульных уражанняў, яна больш моцная. А вось тое, што я не змагу рабіць так, як ён, — гэта яго дэмакратычнасць. Яму мог патэлефанаваць нейкі малады рэжысёр, і ён бег глядзець зусім нікому не вядомых дзяцей дзесьці на навабудоўлі. У яго кабінеце заўсёды было ўсё завалена, ён чытаў нейкія рукапісы. У гэтым плане ён быў зусім бездакорным. Гэта дэмакратычнасць таксама для мяне вялікі ўрок.

**Аўтар праекта Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*А мы нагадваем: дабрачынны рахунак для збору сродкаў на рэканструкцыю будынка пад музей Алеся Адамовіча адкрыты пры аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама, р/р 3642129272326 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», код 760 г. Бабруйск, УНП 701226324. Прызначэнне плацяжу «Для выпрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча».*

*Падтрымаем добрую ініцыятыву!*

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

# АРХІТЭКТУРНАЕ СЭРЦА СТАЛІЦЫ

## Хто прасочыць за якасцю рэстаўрацыйных работ у Ракаўскім прадмесці?

**У гістарычным цэнтры Мінска хутка распачнецца рэстаўрацыя. У 2017 годзе будуць праведзены работы ў Ракаўскім прадмесці. Заказчыкам па ўсіх праектах выступае камунальна-ўнітарнае прадпрыемства «Мінская спадчына». У 2013 годзе «Звязда» ўжо пісала пра іншы будынак у цэнтры, ён знаходзіцца па адрасе Рэвалюцыйная, 28, да якога мела дачыненне згаданая ўстанова. У той час рашэннем Міністэрства культуры работы на аб'екце былі часова прыпыненыя, з-за таго, што не адпавядалі рэстаўрацыйным нормам (і былі прыцягнутыя пасля выпраўлення будаўнічых хібаў). Ці можна быць упэўненым, што ў арганізацыі ўлічылі мінулыя памылкі і гэтым разам аднаўленне правядуць на належным узроўні?..**

Ужо вядзецца работа па распрацоўцы праекта аднаўлення часткі тэрыторыі Ракаўскага прадмесця ў межах былой вуліцы Завальнай (Раманаўскай Слабады) і Ракаўскай. Тут плануецца рэстаўраваць тры пабудовы, што маюць статус гісторыка-



Вуліца Ракаўская.

культурнай каштоўнасці, у тым ліку будынак шпалернай фабрыкі. Адным з асноўных аб'ектаў рэканструкцыі стане таксама будынак хлебазавода №1.

З праектамі ўжо мела магчымасць азнаёміцца **старшы навуковы супрацоўнік аддзела архітэктуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Ірына БАЛУНЕНКА.** Яна адзначыла:

— Часта даводзіцца сутыкацца з тым, што пэўнае асяроддзе (кіруючыся цалкам добрымі намерамі) дапаўняюць страчанай забудовай. Аднак згодна з Венецыянскай хартыяй, прынятай у 1964 годзе, рэстаўрацыя спыняецца тады, калі пачынаецца гіпотэза. Часта ў працэсе стварэння гэтага асяроддзя ствараюцца псеўдагістарычныя стылізацыі... Мне вельмі спадабалася канцэпцыя рэканструкцыі Ракаўскага прадмесця. Але калі прынеслі ўжо архітэктурны праект, стала відавочным — тое, што на эскізе меркавалася як сучасная забудова (тактоўная, якая гарманіруе з асяроддзем), было заменена копіямі будынкаў архітэктуры канца XIX — пачатку XX стагоддзяў, натуральна, менш якаснымі нават з мастацкага пункту гледжання. Добры намер захавання асяроддзя выліўся, у пэўным сэнсе, у фальсіфікацыю гісторыі. Бо гэтыя ўчасткі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя выглядалі крыху інакш. Праблема ў тым, што міжнародных нормаў, якія ўстанавілі ЮНЕСКА, міжнародны савет па захаванні помнікаў і славутасцяў, у нас чамусьці не заўсёды прытрымліваюцца. Але адпаведнасць гэтым дакументам павінна мець не рэкамендацыйны, а абавязковы характар.

Карэспандэнт «Звязды» звярнулася да **галоўнага інжынера «Мінскай спадчыны» Міхаіла ЖЫХА.** Было нечакана пачуць, што адпавядаць міжнародным нормам, на яго думку, беларускім рэстаўратарам не абавязкова. Маўляў, мы маем не такую багатую гісторыка-культурную спадчыну, як нашы замежныя суседзі. Але нават




чалавеку, не спрактыкаванаму ў аднаўленчых работах, відавочна, што, калі маеш мала — захаваць гэта яшчэ больш важна.

— Параўноўваць нашу культурную спадчыну з тым багаццем, што маюць іншыя краіны, крыху некарэктна, — лічыць Міхаіл Жых. — Беларусь пацярпела як ніякая іншая краіна. Нормы Венецыянскай хартыі былі прапісаны для зусім іншых рэгіёнаў. Хартыя — мёртвы дакумент. Яе пастулаты — гэта аснова — але дыялектыка жыцця патрабуе іншага. Для любых дакументаў рэчаіснасць падказвае сваю карэктуру, уносіць змены. Гэта залежыць ад ступені захаванасці помніка, яго фізічнага, маральнага і іншага «старэння». Таму пры патрабаванні аўтэнтычнасці можна шмат пра што разважаць. Якая аўтэнтычнасць — матэрыяльная, духоўная, прадметная?.. Часам аўтэнтычнасць бывае проста вобразнай.

Такое меркаванне аднаго з кіраўнікоў арганізацыі, якая займаецца кіраваннем нерухомай маёмасцю і аднача-сова выступае заказчыкам аднаўлення гістарычнага цэнтра сталіцы, прымушае непакоіцца. Ці не атрымаем мы яшчэ некалькі добра адрамантаваных дамоў замест атмасферных пабудоў, якія самой сваёй стылістыкай шмат пра што гавораць неабыякаваму гараджаніну? **Начальнік аддзела па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Беларусі Наталля ХВІР** паабяцала, што, калі парушэнні нормаў рэстаўрацыі будуць заўважаныя, вінаватых пакараюць:

— Рада пры Міністэрстве культуры павінна адсочваць, ці адпавядае праектнае рашэнне таму, што насамрэч адбываецца на будынку, які мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Міністэрства разам з Мінгарвыканкамам праводзіць агляды на аб'ектах, у тым ліку выдае прадпісанні аб прыпыненні работ, калі парушаюцца нормы. Парушальнікі прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці. Калі будуць заўважаны парушэнні пры рэстаўрацыі гістарычнага цэнтра сталіцы, вінаватыя будуць прыцягнуты да адказнасці.

Як бачым, гэта гісторыя толькі пачынаецца. Пакуль не зразумела, ці плануецца выпраўляць хібы, допушчаныя ў архітэктурным праекце? Многае залежыць і ад неабыякавасці грамадскасці. Калі нам самім не ўсё роўна, што адбываецца з сэрцам беларускай сталіцы, іншая таксама будуць сачыць за яго больш ашчадна.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

**Ірына Балуненка заўважае:**

*— Трэба больш пільна сачыць за захаванасцю помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны ў сельскай мясцовасці. Караць за парушэнне іх цэласнасці. З гэтым мы часта сутыкаемся ў сакральнай архітэктуры — у вясковых храмаў зносяць пэўныя аўтэнтычныя элементы і ставяць канструкцыі, якія раней ніколі не існавалі. Нават у полацкай Спаса-Ефрасіннеўскай царкве самавольна замянілі купал XIX стагоддзя на сучасную «цыбуліну». Гэта ствaрыла нават на міжнародным узроўні вялікія праблемы. Сёння, на жаль, за такі вандалізм ніхто не карае і на ранейшыя месцы страчаныя каштоўнасці не вяртае. Гістарычная праўдзівасць і мастацкая каштоўнасць помніка атрымліваецца разбуранай, але вінаватых не прыцягваюць да адказнасці. Гледзячы на гэта, і іншыя спакушаюцца рабіць не зусім сумленную рэстаўрацыю.*

ПАНТЭОН АЙЧЫНЫ

# Святы Кірыла Тураўскі

**(Каля 1130—1182)**



Ягонае імя па праве называюць першым сярод усходнеславянскіх пісьменнікаў, і не таму, што ён сапраўды быў першым аўтарам сярод усходніх славян, а таму, што творчасць вытрымала праверку часам і жыццём, і дасюль яго творы — узор высокага мастацкага слова, непараўнальнага ўздыму натхнення. Феномен Кірылы Тураўскага здзіўляе і цяпер і выклікае трапяткую пашану і ўдзячнасць. Ягоная творчасць не для будзённага чытання, гэта сакральныя словы павучання, урачыстыя гімны і малітвенныя звароты да Бога.

Вялікі паэт і асветнік нашага далёкага мінулага, ад якога нам дайшло так мала, «другі Златавуст, што ярчэй за ўсіх працяў на Русі», як сказана ў ягоным Жыцці. Створанае Кірылам Тураўскім (казанні, прытчы, малітвы, «стиси»...) зачароўваюць духоўнай напоўненасцю, паэтычнасцю і гарманічнасцю, сімвалічнай вобразнасцю і багаццем метафар, лірызмам і філасофіяй. Ён усхваляў Бога, яго вялікую міласэрнасць да чалавека, павучаў вернікаў, каб яны не «умроша душевною смертию», даў ім узоры малітваў да Бога. «Мы ж, братове, станем пакорлівы і паслухмяны, будзем выконваць Божыя наказы кніг святых, у мудрасць іх паглыбляючыся; не п'яным розумам, а цвярозым умацуем жыццё з усімі ўміронымі праведнікамі». Перафразуючы выказванне святога Кірылы, пра яго скажам, што ён быў ратай слова, які ганарлівых і бязверных прыводзіў да духоўнага ярма.

З «Памяці святога айца нашага Кірыла, епіскапа Тураўскага» вядома, што Кірыла нарадзіўся ў Тураве — тагачаснай сталіцы Тураўскага княства, у сям'і багатых бацькоў, «але не ўзлюбіў багацця і марнае славы гэтага свету, а найбольш любіў вучэнне Боскіх кніг». Кажучы па-сучаснаму, ён быў інтэлектуал, які набраўся кніжнага розуму, бо гэта для яго «суть скровища вечныя жизни», але ж «не собе единому есть на спасение, но инем многым послушающим его». Свой дар Кірыла прысвяціў не асабістаму ўзвышэнню, а людзям, кіруючыся разуменнем яго прызначэння. На гэта ён указваў у адным са сваіх твораў: «и видев Господь гордый его ум, возмет Свой от него талант». Нядзіўна, што юнак ідзе ў манастыр, дзе выбраў жыццё стоўпніка — адасобіўся ў вежы-слупе і засяродзіўся там на малітвенным служэнні Богу. Ён выбраў свой шлях, як вызначыў у адным з твораў, «в разум истинный прийти и иных научити». Кірыла пісаў казанні, словы, гімны, прытчы, каноны, вершы, малітвы «карысныя душы». Ягоныя творы ў шматлікіх спісах разыходзіліся па ўсёй Русі. Па ягоных малітвах звярталіся да Бога, кляліся перад ім і прасілі дапамогі даравання за грахі. Слава пра «кніжніка з Турава» ішла шырокім розгаласам па Русі. Тураўцы разам са сваім князем прасілі кіеўскага мітрапаліта паставіць Кірылу тураўскім епіскапам. Мітрапаліт задаволіў іх жаданне.

Стаўшы тураўскім епіскапам, Кірыла «добра працаваў... дзеля Божай Царквы». Ён выступіў супраць ерасі нейкага Фядоркі-ерэтыка. Пэўна, гэта выкрыццё арыянства ў «Слове на сабор 318 святых айцоў». Філасофскім роздумам напоўнена «Прытча пра душу і цела». Гэта своеасаблівы трактат аб творчасці, адказнасці творцы за свае слова і талент, што павінны служыць Богу і людзям. Служэнне Кірылы выразна праявілася ў ягоных малітвах (да нас дайшло больш за 30).

Малітвы — вяршыня творчасці Кірылы Тураўскага. Сапраўдныя шэдэўры сакральнай літаратуры і разам са «Словам аб палку Ігаравым» вяршыня старажытнарускай літаратуры. Вось які трывалы падмурак заклаў святы Кірыла для нашага прыгожага пісьменства. «І цяпер малітвы яго могуць лічыцца найлепшымі з малітоўных твораў, што існуюць у царкоўным ужытку», — гэтае прызнанне, зробленае ў 1880 годзе епіскапам Мінскім і Тураўскім Яўгеніем, яшчэ раз пацвярджае факт прызнання за Кірылам Тураўскім такога высокага чыну, як «настаўнічы наш», «другі Златавуст, што ярчэй за ўсіх працяў на Русі!», «свяціцелю, бо найсвятлейшым вучэннем сваім асвяціў зямлі Рускія!», «сонца, што асвятляе розумам Божым азмрочаных і цёмных!» Паміж гэтымі прызнаннямі ляжаць стагоддзі, але сутнасць іх аднолькавая.




Вельмі красамоўна, што цытаваныя ніжэй словы ўзяты з «Памяці», напісанай у часы татара-мангольскага ярма, калі, здаецца, чорная ноч назаўсёды апусцілася на Русь і малітвы Кірылы Тураўскага зрабіліся духоўнай падтрымкай вернікам. І веруючы ў сілу ягонага слова, аўтар «Памяці» просіць святога маліць Бога, «каб той пазбавіў нас бедаў і гора ад паганых бязбожных агаран, якія катуюць нас, і каб атрымалі мы міласць Яго і дараванне грахоў тваімі малітвамі, і асалоду добрасцяў вечных у наступным жыцці!»

Да творчай спадчыны Кірылы Тураўскага звярталіся і пазней. У 1569 годзе друкары Пётр Мсціславец і Іван Фёдараў у Заблудаве надрукавалі ў «Евангеллі вучыцельным» ягонае «Слова на Ушэсце», а ў 1596 годзе ў Вільні братчыкі Віленскага брацтва Сашэсця Святога Духа выдаюць «Малітвы паўсядзённыя». Малітвы Кірылы Тураўскага па задуме выдаўцоў павінны былі падтрымаць праваслаўных вернікаў у цяжкі для іх час — увядзення Брэсцкай царкоўнай уніі на беларускіх і ўкраінскіх землях.

Быў ён паміж Богам і людзьмі пасрэднікам. Людзям нёс Боскае слова, навучаючы іх праведнасці, а да Бога прамаўляў высокай мовай чалавечай любові. Ён пісаў малітвы, каб людзі самі размаўлялі з Богам! І верылі праваслаўныя хрысціяне, што на нябёсах перад аблічкам Бога святы Кірыла служыць ім: «Ты — нашыя анёльскія вусны на небе!»

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Лёс у гісторыі

# БЫЦЬ «РАДЗІВІЛІХАЙ»

## Жыццё і справы прадстаўніц знакамітага роду

**Многія пакаленні даследчыкаў і аматараў беларускай гісторыі захапляюцца прыгажосцю і розумам Барбары Радзівіл, з задавальненнем чытаюць п'есы Францішкі Уршулі Радзівіл, глядзяць іх пастаноўкі ў тэатры, удзячна згадваюць мецэнацкую дзейнасць Магдалены Радзівіл. Як і ў кожнага ўплывовага роду, гісторыя магнатаў Радзівілаў мае два бакі: мужны, смелы, ваяўнічы — мужчынскі, і вытанчаны, захоплены, адданы — жаночы. Але лёс часам распараджаецца так, што жонкі, сёстры застаюцца ў цені сваіх знакамітых мужоў і братоў, а звесткі пра іх не менш значную працу па ўладкаванні палацаў, збіранні бібліятэк, літаратурную і асветніцкую дзейнасць губляюцца ў глыбіні стагоддзяў.**

Каб крыху выправіць гэтую несправядлівасць і пагутарыць пра не настолькі вядомыя і яскравыя імёны верхніх дочак і сужэнак Радзівілаў, у Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Нясвіж» сабраліся даследчыкі гэтага знакамітага роду з Беларусі, Украіны, Польшчы. Тут прайшла канферэнцыя «Жанчыны ў гісторыі роду Радзівілаў».

— Для ўсіх жанчын у родзе Радзівілаў прыгожая і разумная Барбара была прыкладам, узорам, якому імкнуліся адпавядаць, — кажа **доктар габілітаваны, прафесар Сілезскага ўніверсітэта ў Катавіцах (Польшча) Марыола ЯРЧЫК,** — Прадстаўнікі магнацкага роду бралі сабе ў жонкі і знатных асоб, і жанчын больш простага паходжання. Таксама не мела істотнага значэння веравызнанне будучай Радзівіліхі: жаніліся з праваслаўнымі, каталічкамі і пратэстанткамі. Існавала толькі досыць строгае правіла — забарона на шлюб паміж блізкімі сваякамі — стрыечнымі братамі і сёстрамі, але і яна часам парушалася.



Петранела Радзівіл.

Як расказала прафесар Ярчык, прыклад такога парушэння — саюз Ганны Марыі і яе стрыечнага брата, намнога старэйшага за яе Багуслава Радзівілаў. Маці і цётка Ганны Марыі былі знанымі прыгажунямі, таму з самага дзяцінства дзяўчынцы прарочылі прыгажосць і поспех у мужчын. Маці была каталічкай, але бацька — Януш Радзівіл схіляўся да пратэстантызму. Дзяўчынка рана страціла бацькоў: спачатку памерла маці, а калі Ганне Марыі было 15, не стала і бацькі. Менавіта з гэтага часу яна пачала актыўную перапіску са стрыечным братам Багуславам. Так паміж імі завязаліся цёплыя стасункі, а лісты жанчыны можна назваць не толькі помнікамі эпістальярнага жанру, але і часткова — літаратурнымі творамі. Сям'я была супраць іх саюза: прычынамі называлі блізкае сваяцтва і вялікую розніцу ва ўзросце. Аднак насуперак усяму шлюб усё ж адбыўся.

— Шлюб Ганны Марыі і Багуслава быў шчаслівым, але досыць кароткім, — кажа спадарыня Марыёла. — Жанчына сама нібыта прадчувала раннюю смерць, баялася паўтарыць лёс маці — памерці пры нараджэнні дзіцяці. Але так і сталася, яна памерла праз некалькі тыдняў пасля нараджэння дачкі Людвікі Каралiны.

Трагічнай можна назваць і гісторыю жыцця Петранелы Радзівіл, жонкі полацкага ваяводы Станіслава Давойны. Пра яе падчас канферэнцыі расказала **малодшы навуковы супрацоўнік музея-запаведніка «Нясвіж» Ірына МІЛІНКЕВІЧ:**



Ганна Марыя Радзівіл.

— На чатыры гады маладзейшая за каралеву Барбару, Петранела Радзівіл была не менш значнай асобай свайго часу. Яна была другой дачкой (з трох) Яна Радзівіла. Нарадзілася Петранела ў 1526 годзе, пра яе дзяцінства і юнацтва амаль што нічога невядома, але як прадстаўніца высокага роду яна, безумоўна, атрымала еўрапейскую адукацыю і выхаванне. У 1542 годзе нечакана памёр яе бацька.

**«Існавала і досыць строгае правіла — забарона на шлюб паміж блізкімі сваякамі — стрыечнымі братамі і сёстрамі, але і яна часам парушалася».**

Шаснаццацігадовую Петранелу Радзівіл у гэтым жа годзе (1542) выдаюць замуж за Станіслава Станіслававіча Давойну. Зразумела, шлюб стаў вынікам маёмасных разлікаў. Станіслаў Давойна ў маладосці служыў пры кіеўскім ваяводзе Неміровічу, удзельнічаў у барацьбе з татарамі і маскоўскім войскам. У 1528 годзе стаў каморнікам каралевы Боны, у 1530 — каралеўскім дваранінам. Хуткі кар'ерны рост павінен быў замацавацца і роднаснымі сувязямі. Што і здарылася дзякуючы шлюбу з Петранелай Радзівіл. Гэты шлюб прынёс яму добры пасаг. У 1542 годзе маладажоны з'яўляюцца ў Полацку.

— Станіслаў Давойна сумленна выконваў абавязкі ваяводы, — расказвае Ірына Мілінкевіч. — Багаты Полацк, дзякуючы добрым міжнародным сувязям, не застаецца ў баку ад заходніх павеваў, як культурных, так і рэлігійных. Можна меркаваць, што рэнесансная атмасфера закранула не толькі каралеўскі двор. Таму ў 1550-я гады быў заснаваны полацкі пратэстанцкі мяшчанскі збор, феадальнымі патронамі якога стала частка мясцовай шляхты. Невядома, ці была ў спісе прыхажан Петранела Радзівіл-Давойна, але можна выказаць здагадку, што яна, як і многія з яе родзічаў, падтрымлівала пратэстанскія ідэі.

Калі Іван Грозны захапіў Полацк, Станіслава Давойну разам з Петранелай і шляхтай выслалі ў Маскву. Цар спадзяваўся атрымаць за іх багаты выкуп. Пасля перамоў 1566 года полацкая шляхта была часткова абменена на рускіх палонных, а часткова выкуплена. Станіслаў Давойна намаганнямі вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста быў выкуплены ў 1567 годзе за 1000 злотых і абменены на рускага князя Васіля Цёмкіна, любімага апрычніка Івана Грознага. А што тычыцца Петранелы Радзівіл, яна памерла ў маскоўскім палоне ў тым жа годзе, калі муж быў адпушчаны на волю. Але гісторыя на гэтым не канчаецца. Негледзячы на тое, што Станіслаў Давойна потым яшчэ два разы быў жанаты, ён намагаўся вярнуць цела сваёй першай жонкі на родную зямлю.

Перамовы аб вяртанні цела Петранелы Радзівіл у абмен на цела Пятра Шуйскага вяліся да 1570 года. Пётр Шуйскі пасля захопу Полацка з'яўляўся там намеснікам цара і ваяводам. Пры бітве пад Чашнікамі ў студзені 1564 года быў забіты. Яго цела Мікалай Радзівіл Руды прывёз у Вільню, дзе яго і пахавалі ў праваслаўнай царкве. Абмен, нягледзячы на сабраныя Давойнам дакументы, так і не адбыўся. Сам Станіслаў у апошнія гады жыцця быў пасіўны, функцыі ваяводы выконваў намінальна і памёр праз пяць гадоў пасля смерці першай жонкі.

Ёсць у гісторыі роду Радзівілаў і манахіня-ігумення бернардзінскага манастыра. Жыццёваму лёсу Крысціны Яўфіміі Радзівіл прысвяціла свой даклад **доктар габілітаваны, прафесар Сілезскага ўніверсітэта ў Катавіцах (Польшча) Іаланта ГВЁЗДЗІК.** Яна расказала, што Крысціна Яўфімія была дачкой Станіслава Радзівіла і ўнучкай Мікалая Радзівіла Чорнага. У дзяцінстве дзяўчынку аддалі на вучобу ў манастыр сясцёр бернардзінак, дзе яна вывучала духоўныя рукапісныя кнігі, цырымоніі і адметнасці веры. У 16 гадоў Крысціна Яўфімія паўстала перад выбарам — вярнуцца дадому і выйсці замуж ці застацца ў манастыры. Яна абрала другі шлях: здала прафесійны экзамен, ахвяравала манастыру свой багаты пасаг і засталася там працаваць. Крысціна Яўфімія кіравала 60 законніцамі, займалася гаспадарчымі справамі, вяла актыўную перапіску з багатымі сваякамі. Дарэчы, нягледзячы на тое, што Радзівілы былі прыхільнікамі пратэстантызму, яны ніколі не адмаўлялі ў грашовай дапамозе сваёй сваячцы-ігуменні каталіцкага манастыра.

**«Не мела істотнага значэння веравызнанне будучай Радзівіліхі: жаніліся з праваслаўнымі, каталічкамі і пратэстанткамі».**



Ігумення Крысціна Яўфімія Радзівіл.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Нашы традыцыі

# КРУЦІСЯ, ГАНЧАРНЫ КРУГ,

## захоўвай промысел продкаў



**Вёска Гарадная — адзін з самых старажытных населеных пунктаў на Беларусі. Як і адзін са старажытных цэнтраў ганчарнай справы. Гэты народны промысел захаваўся да нашых часоў. Ён характарызуецца сваёй унікальнасцю, прастатой і выклікае захапленне не толькі ў беларусаў, але і ў замежных гасцей. Хто ж такі ганчар? У якіх умовах ён жыў і працаваў? На гэтыя пытанні даў адказ Аляксей ВЯРЭНІЧ, спецыяліст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Столінскага раёна і супрацоўнік гараднянскага музея «Сядзіба ганчара».**

— Ідэя музея-сядзібы ў тым, каб адлюстраваць тагачасны быт сям'і ганчара. Каб паказаць, у якіх умовах жылі людзі, — расказвае Аляксей Івановіч. — Таму мы і выбралі ў якасці музея звычайную сялянскую драўляную хатку.

Раней у тым доме сапраўды жыў ганчар. Сям'я ў яго была вялікая: жонка і дзевяць дзяцей. І толькі два пакойчыкі, у якіх павінны былі ўсе размясціцца... Таму ўнутраная абстаноўка добра прадумана. Напрыклад, ганчар наробіць посуду, а вырабы патрэбна прасушыць да першага абпалу. Дзе гэта зрабіць? Дык вось, да столі прывязваліся спецыяльныя дошкі, якія называюцца пястры, на іх і сушыліся.

У доме ганчара заўсёды былі жорны. Не толькі для таго, каб малоць збажыну. А і для таго, каб зрабіць так званую паліву (сумесь вады і расцёртага ў парашок свінцу або волава, якой пакрываецца выраб).

— У ганчара заўсёды быў конь і воз, — працягвае супрацоўнік музея. — Майстар загружаў у яго ўвесь зроблены посуд і ехаў гандляваць па вёсках. Ён заўсёды як прыязджаў, крычаў «Гаршкі! Купляйце гаршкі!» З'язджаў гаспадар звычайна на месяц, а то і на болей.

Працэс стварэння гаршка не такі просты, як можа паказацца на першы погляд. Гліну нарыхтоўвалі ўвосень. Калі яна была сухая, то дадавалі вады, збівалі ў глыбы і пакідалі на зіму. Потым яе збівалі ў «бабку» спецыяльнай драўлянай вялікай даўбешкай у форме молата. Затым бралі струг і тоненькімі палоскамі зразалі. Аперацыю паўтаралі некалькі разоў, пакуль гліна добра не перамешвалася і не пераўтваралася ў аднародную масу без карэньчыкаў і камякоў — працэс даволі працаёмкі. Потым майстар садзіўся за ганчарны круг.

Абпальвалі гаршкі ў спецыяльнай печы, якая называецца горан. Для паліва выкарыстоўвалі сасновыя пянькі і карані. Таксама патрэбна была дастатковая колькасць асінавых, бярозавых і дубовых дроў. Тэхналогія абпальвання і выкарыстання розных відаў паліва заўсёды была прафесійным сакрэтам майстроў.

Гараднянская кераміка — белагліняная. Таксама ёсць гліны шэрыя, чырвоныя, чорныя. У Гарадной з гэтым матэрыялам пачалі працаваць яшчэ ў XV стагоддзі. Вакол — лясы ды балоты, людзі жылі бедна, таму гліна давала асноўны заробак. «У даваенны перыяд каля трохсот чалавек займалася ганчарнай справай, — расказвае **першы дырэктар Цэнтра ганчарства Алімпіяда ЛЕАНАВЕЦ.** — На гэты момант засталося толькі чатыры патомныя ганчары, маладзі амаль што няма».

Жыў у вёсцы цікавы ганчар — Мацвей Пячонка. У чалавека была толькі адна рука, але ён вельмі спрытна рабіў посуд. Пакуль другі ганчар рабіў нешта адно, Мацвей Якаўлевіч вырабляў ужо дзве пасудзіны.

«Дзесьці ў 1970-я гады забілі трывогу, што паступова знікае ўнікальная тэхналогія гараднянскага ганчарства. Дарэчы, навукоўцы высветлілі, што яна ідзе каранямі ў антычнасць. У тыя гады ў нашу вёску з Казахстана прыйшоў ліст, у якім прасілі прыслаць мясцовага ганчара для перадачы вопыту. На два тыдні ездзіў туды чалавек і вучыў казахаў унікальнаму спосабу стварэння гаршкоў. Таксама некалі ў 1980-я гады немцы рабілі аналіз гараднянскай гліны і высветлілі, што аналагаў ёй у Еўропе няма», — успамінае Алімпіяда Дзмітрыеўна.

Цяпер дырэктарам Цэнтра ганчарства з'яўляецца Васіль Казачок. «Раней на Беларусі было шмат цэнтраў ганчарства, а зараз застаўся толькі ў нас. Патомныя майстры працягваюць традыцыі, атрыманыя ад бацькоў. Але старое пакаленне адыходзіць, а маладыя людзі, на жаль, выязджаюць у горад, шукаюць больш выгадную працу».

Цяпер галоўная задача патомных майстроў і больш маладых людзей, якія асвоілі тэхналогію, — захаваць традыцыйнае, унікальнае ганчарства, якое перадалося ад продкаў, пакінуць яго ў спадчыну дзецям. У майстэрні Цэнтра ганчарства ёсць два гурткі па 8 вучняў 5-7 класаў. З дзецьмі займаюцца два кіраўнікі. Адзін з іх — Рыгор Кавалька — чалавек, які 65 гадоў прысвяціў ганчарству. А пачынаў яшчэ дзесяцігадовым хлопчыкам. І ганчарная справа стала справай усяго жыцця. Дарэчы, раней кожны хлопец абавязкова павінен быў валодаць ганчарным майстэрствам. Калі ён гэтага не ўмеў, то ніякая дзяўчына з Гараднай замуж за яго не пайшла б. Ці заставайся нежанатым, ці шукай сабе жонку з іншай мясцовасці.

У 2010 годзе Міністэрствам культуры традыцыйнаму ганчарнаму промыслу вёскі Гарадная нададзены статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, а Цэнтр ганчарства ўнесены ў афіцыйны пералік аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Брэсцкай вобласці.

***Майце на ўвазе.*** *Вёска Гарадная з'яўляецца пагранічнай зонай. Таму пры ўездзе патрэбна мець пры сабе пашпарт і даведку аб аплаце дзяржаўнай пошліны памерам 4 руб. 20 кап. З першага студзеня патрэбен будзе толькі пашпарт: уезд становіцца бясплатным.*

**Марына ЛЯШКЕВІЧ,**
*Столінскі раён*

## Извещение о проведении 16 декабря 2016 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена в бел. руб. без НДС (бел. руб. образца 2000 года) | Размер задатка в бел. руб. (бел. руб. образца 2000 года) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Станок универсальный заточной мод. 3Е642Е, год выпуска – 1991 | 4250051 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 3 300,00 (33 000 000) | 330,00 (3 300 000) |
| 2. | Станок фрезерный широкоуниверсальный мод. 67К25ПР, год выпуска – 1992 | 4234877 | | 2 600,00 (26 000 000) | 260,00 (2 600 000) |
| 3. | Печь мод. ДСПТ-12, год выпуска – 1991 | 4234350 | | 202 677,97 (2 026 779 700) | 20 000,00 (200 000 000) |
| 4. | Печь мод. ДСПТ-12, год выпуска – 1991 | 4234351 | | 202 677,97 (2 026 779 700) | 20 000,00 (200 000 000) |
| 5. | Печь мод. ИЧКМ-16/08Н-1, год выпуска – 1991 | 4234352 | | 95 491,36 (954 913 600) | 9 500,00 (90 000 000) |
| 6. | Печь мод. ИЧКМ-16/08Н-1, год выпуска – 1991 | 4234353 | | 95 490,58 (954 905 800) | 9 500,00 (90 000 000) |

**Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.**

**Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **16 декабря 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 15.11.2016 по 14.12.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017)217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).**

## Извещение об открытом аукционе по продаже имущества, расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 127 13 декабря 2016 года

| Вид аукциона | Открытый |
|---|---|
| Предмет аукциона | Комплекс зданий, изолированных помещений, сооружений и оборудования, включающий 18 капитальных строений (производственные корпуса, проходные, трансформаторные подстанции, бетонно-смесительный узел № 2, лаборатория, пропарочные камеры и т.д.), водопроводную сеть, канализацию керамическую фекальную, канализацию керамическую ливневую, внутри- и внеплощадочные электрические сети, оборудование подстанций, полигонов и т.д. |
| Начальная цена продажи | **8 073 462,69** (с учетом НДС 20%) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 440100000001006546 площадью 0,1874 га,<br>440100000001009177 площадью 0,2449 га,<br>440100000001006550 площадью 0,6757 га,<br>440100000001009185 площадью 0,0178 га,<br>440100000001003240 площадью 0,1151 га,<br>440100000001009178 площадью 0,0707 га. |
| Месторасположение земельных участков | **г. Гродно, ул. Суворова, 127** |
| Продавец | **Открытое акционерное общество «Гроднопромстрой»** |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования, аренда |
| Сумма задатка | 800 000 рублей |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546 |
| Дата проведения аукциона | **13 декабря 2016 года** |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 |
| Дата и время начала приема документов | 14 ноября 2016 года 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 7 декабря 2016 года 17.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости». **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3-х рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Адрес сайта: www.grodno.gov.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

### Организатор аукциона – Прибытковский сельский исполнительный комитет Гомельского района Гомельской области

| № п/п | Адрес, кадастровый номер участка | Характеристика инженерных коммуникаций | Размер земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена земельного участка, руб. | Размер задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Республика Беларусь, Гомельская область, Гомельский район, Прибытковский сельсовет, п. Цагельня, ул. Полевая, У-33, 321085603601000466 (лот №1) | Участок свободен от застройки. В радиусе менее 100 водопровод, газопровод, линия электропередач | 0,1474 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 18 699 р. 80 к. | 1 869 р. 98 к. | 1 105 р. 20 к. + Расходы на размещение информации в СМИ |
| 2. | Республика Беларусь, Гомельская область, Гомельский район, Прибытковский сельсовет, п. Цагельня, ул. Полевая, У-38, 321085603601000463 (лот №2) | Участок свободен от застройки. В радиусе менее 100 водопровод, газопровод, линия электропередач | 0,14987 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 18 991 р. 58 к. | 1 899 р. 16 к. | 1 142 р. 2 к. + Расходы на размещение информации в СМИ |
| 3. | Республика Беларусь, Гомельская область, Гомельский район, Прибытковский сельсовет, п. Цагельня, ул. Полевая, У-42, 321085603601000465 (лот №3) | Участок свободен от застройки. В радиусе менее 100 водопровод, газопровод, линия электропередач | 0,1499 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 19 016 р. 96 к. | 1 901 р. 70 к. | 1 099 р. 96 к. + Расходы на размещение информации в СМИ |
| 4. | Республика Беларусь, Гомельская область, Гомельский район, Прибытковский сельсовет, п. Цагельня, ул. Новая, У-15, 321085603601000414 (лот №4) | Участок свободен от застройки. В радиусе менее 100 водопровод, газопровод, линия электропередач | 0,1398 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 19 338 р. 11 к. | 1 933 р. 81 к. | 1 041 р. 99 к. + Расходы на размещение информации в СМИ |

**1. Аукцион состоится 7 декабря 2016 года в 14.30 в административном здании Гомельского районного исполнительного комитета по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, малый зал (3-й эт.).**

2. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. Аукцион проводится при двух и более участниках, претендующих на участок.

Участнику необходимо подать заявление в Прибытковский сельский исполнительный комитет с указанием кадастрового номера земельного участка, который он желает приобрести в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: квитанцию об оплате задатка (реквизиты платежа уточняются в бухгалтерии Прибытковского сельисполкома), а также предоставляют копию документа, содержащего их индикационные сведения без нотариального засвидетельствования. Представители гражданина – нотариально удостоверенную доверенность. При подаче документов на участие в аукционе представители гражданина предоставляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Гомельская область, Гомельский район, аг. Прибытки, ул. Ленина В.И., д. 68, кабинет, № 3 (тел. 8 0232 934584).

Последний день приема документов – **5 декабря 2016 года.**

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. При этом ему в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка.

4. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан подписать протокол аукциона, не позднее 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка, затраты на подготовку и проведение аукциона и опубликования настоящего изменения.

5. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

6. С порядком проведения аукциона можно ознакомиться в Прибытковском сельском исполкоме.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## по объекту: «Многоквартирный жилой дом №7 (по генплану) по пр. Победителей в границах жилого района Лебяжий со встроенными помещениями административно-торгового назначения»

**Сведения о застройщике.**

Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома № 2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580566. **Юридический адрес**: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом №20 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 40 месяцев;
- жилой дом №12 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 24 месяца;
- жилой дом №14 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 47 месяцев;
- жилой дом №8 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 15 месяцев;
- жилой дом №10 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 13 месяцев;
- жилой дом №16 по ул. Мястровская, фактический срок строительства – 20 месяцев;
- жилой дом №29 по ул. Мястровская, фактический срок строительства – 18 месяцев;
- жилой дом №3А по ул. Нововиленская, фактический срок строительства – 7 месяцев;
- жилой дом №7Б по ул. Нововиленская, фактический срок строительства – 9 месяцев;
- малоэтажные жилые по ул. Зацень, 45А, 45Б, 45В, фактический срок строительства – 5 месяцев;
- жилой дом №123 по пр. Победителей, фактический срок строительства – 27 месяцев.
- жилой дом №37А по ул. Каховская, фактический срок строительства – 52 месяца.

Цель строительства многоквартирного жилого дома №7 (по генплану) по пр. Победителей в границах жилого района Лебяжий со встроенными помещениями административно-торгового назначения общей площадью – 7693,75 кв.м, в том числе общая площадь квартир – 4180,1 кв.м – увеличение уровня обеспеченности населения жильем.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта – август 2015.

Окончание строительства объекта – 15 октября 2016.

По проектно-сметной документации получено положительное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 14.12.2012 №845-60/12; от 25.04.2015 №115-60/15; от 23.11.2015 №856-60/15; от 29.07.2016 №472-60/16.

Земельный участок передан коммунальному унитарному дочернему предприятию «Управление капитального строительства Центрального района» решением Мингорисполкома от 25.06.2015 №1632, от 09.01.2015 №21, от 28.04.2016 №1142.

Получено разрешение Госстройнадзора от 03.08.2015, от 23.12.2015, от 13.07.2016, от 01.08.2016 №2-209Ж-027/15.

Генеральный подрядчик – ОАО «Стройтрест №35» (договор генподряда № 197 от 27.07.2015).

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 5,1% общей площади жилого дома.

Объект «Многоквартирный жилой дом №7 (по генплану) по пр. Победителей в границах жилого района Лебяжий со встроенными помещениями административно-торгового назначения» запроектирован 2-секционным 5-этажным с цокольным этажом, техническим подпольем и чердаком. Цокольный этаж – помещения административно-торгового назначения с отдельными входами, в состав которых входят служебные помещения, торговые залы, комнаты приема пищи, хранения инвентаря и санитарные узлы. 1–5-й этажи занимают квартиры: всего – 58 квартир, в том числе однокомнатных – 30 шт., двухкомнатных – 10 шт., трехкомнатных – 18 шт.

Конструкция здания – монолитный каркас со стенами с плоскими монолитными перекрытиями. Для наружной отделки применена декоративная штукатурка, профилированный металлический лист, блоки декоративные бетонные. Окна и балконные двери из профиля ПВХ. Наружные входные двери – металлические.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается 15 квартир, в том числе:**

- 5 (пять) однокомнатных квартир общей площадью 37,29 кв.м, 50,88 кв.м и 55,69 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади – 900 (девятьсот) долларов США при единовременной уплате цены договора (100%);

- 1 (одна) однокомнатная квартира общей площадью 48,00 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади – 1000 (одна тысяча) долларов США при единовременной уплате цены договора (100%);

- 9 (девять) трехкомнатных квартир общей площадью от 101,64 до 125,96 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади:

- 850 (восемьсот пятьдесят) долларов США при единовременной уплате цены договора (100%);

- 900 (девятьсот) долларов США при поэтапной оплате по графику платежей в течение 6 месяцев;

- 950 (девятьсот пятьдесят) долларов США при поэтапной оплате по графику платежей в течение 12 месяцев.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 7 помещений административно-торгового назначения:**

| Наименование | Общая площадь (кв.м) | Цена за 1 м кв. при 100% оплате (долларов США) | Цена за 1 м кв. при поэтапной оплате в течение шести месяцев (долларов США) | Цена за 1 м кв. при поэтапной оплате в течение двенадцати месяцев (долларов США) |
|---|---|---|---|---|
| административно-торговое помещение №1 (секция №1), | **111,05** | **1 050** | **1 100** | **1 150** |
| административно-торговое помещение №2 (секция №1), | **130,03** | **1 050** | **1 100** | **1 150** |
| административно-торговое помещение №3 (секция №1), | **119,63** | **1 050** | **1 100** | **1 150** |
| административно-торговое помещение №1 (секция №2) | **68,47** | **1 050** | **1 100** | **1 150** |
| административно-торговое помещение №2 (секция №2) | **118,28** | **1 050** | **1 100** | **1 150** |
| административно-торговое помещение №3 (секция №2) | **130,03** | **1 050** | **1 100** | **1 150** |
| административно-торговое помещение №4 (секция №2) | **111,05** | **1 050** | **1 100** | **1 150** |

**Условия оплаты.** Обязательство дольщика по уплате цены объекта долевого строительства (цены договора) исполняется в белорусских рублях в сумме, эквивалентной долларам США. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком на день платежа на специальный и расчетный счета застройщика.

При оплате по графику – первоначальный взнос в размере 40% стоимости объекта долевого строительства в течение 7 (семи) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

При поэтапной оплате по графику платежей дольщик обязан вносить плату за жилищно-коммунальные услуги по объекту долевого строительства до момента государственной регистрации права дольщика на этот объект.

При единовременном платеже – 100% стоимости объекта долевого строительства – в течение 7 (семи) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

**При заключении договора с гражданином, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, необходимо:**

- личное присутствие гражданина или его представителя, наличие паспорта или доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 21 ноября 2016 года **по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 7.**

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве считается не поданным, и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента заключения договоров создания объекта долевого строительства на все количество продекларированных помещений.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно по адресу: **г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7, каб. 111, тел. 306-07-26.**

■ Прафесіяналы

# КАЛІ КУЛІ «ГАВОРАЦЬ»

**Заканадаўцы Беларусі прадугледзелі крымінальную адказнасць за незаконнае абыходжанне з агнястрэльнай зброяй ці яе кампанентамі. Менавіта таму для судовага эксперта-баліста вельмі важна вызначыць, які ж прадмет ляжыць перад ім: сапраўдная агнястрэльная прылада ці толькі выраб, які валодае пэўнымі яе ўласцівасцямі. Гэта ў далейшым можа вельмі істотна ўплываць на кваліфікацыю крымінальнай справы, у межах якой і праводзіцца экспертыза.**
**Завесу таямніцы над балістычнай экспертызай прыўзняў намеснік начальніка ўпраўлення крыміналістычных экспертыз і ўлікаў, начальнік аддзела крыміналістычных экспертыз упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Мінску Аляксандр КРЫВЕЦ.**


Фота БЕЛТА.

## ШТО ЛІЧЫЦЬ ЗБРОЯЙ?

— Кажучы па-навуковаму, агнястрэльнасць — гэта прынцып кідання снарада за кошт ціску, які ўтвараецца пры згаранні пораху. Гэта і ёсць асноўны прынцып класіфікацыі зброі. Таксама ў ёй мусяць прысутнічаць узброенасць, якая ўключае ствол, які накіроўвае палёт, затвор, які запірае канал ствала, і ўдарна-спускавы механізм, які запальвае порах у патроне. Усё гэта ў сукупнасці і вызначае, ці з'яўляецца зброя агнястрэльнай.

Хітрыкі злачынцаў, з-за якіх выкарыстаная зброя становіцца непрыдатнай, не ўплываюць на канчатковы вынік экспертызы. Вось да нас няўдаўна паступіў рэвальвер. У яго механізме адсутнічае ўдарнік. Зрабіць стрэл немагчыма. Але ў яго ёсць усе астатнія прыкметы агнястрэльнай зброі. Галоўнае пытанне, якое трэба вырашыць падчас эксперымента — ці страляе гэты рэвальвер з выкарыстаннем аналагічнай дэталі?

У Беларусі вельмі даўно была створана спецыяльная кулегільзатэка. У ёй захоўваюцца ўзоры, якія дапамагаюць вызначаць, ці не выкарыстоўвалі злачынцы гэтую зброю раней. Бывалі выпадкі, калі зброю знаходзілі нават праз гады.

## З МАЎЗЕРАМ І ППШ

Часцей за ўсё на стол эксперта трапляе дробнакаліберная зброя. Ёй карыстаюцца на паляванні, падчас спартыўных мерапрыемстваў. Не ў апошнюю чаргу з-за вельмі даступных патронаў. Крыху менш праз рукі экспертаў праходзіць пісталетаў ТТ і рэвальвераў «наган» — сярод апошніх прысутнічаюць нават экзэмпляры часоў Грамадзянскай вайны.

Дагэтуль адгукаецца і стралковае «рэха» Вялікай Айчыннай. Нямала зброі тых часоў праваахоўнікі канфіскуюць у «чорных капальнікаў». Сярод іх вельмі шмат карабінаў, вінтовак сістэмы Мосіна, маўзераў, затвораў да іх, аўтаматаў ППШ. Сустракаюцца і нямецкія пісталеты-кулямёты MP-40, якія былі падчас Другой сусветнай вайны на ўзбраенні вермахта.

— У гістарычных фільмах часта ў кадр трапляе зброя, якую зараджаюць з дула. А крыніцай агню служыць крэмній, — кажа Аляксандр Крывец. — Вось такі дульназарадны пісталет трапіў да нас не так даўно. Самае цікавае, што ён старой кустарнай вытворчасці.

Каб вырашыць шматлікія пытанні, якія стаялі перад экспертам, давялося прыкласці шмат намаганняў. Трэба было вызначыць мадэль, краіну, дзе яго зрабілі. І самае галоўнае — зрабіць кантрольныя стрэлы пры адсутнасці патрэбных капсуляў, пораху і куль.

Некаторыя крымінальныя ўмельцы перарабляюць газавыя і нават будаўнічыя пісталеты пад баявыя. Жаданне «замесці сляды» хавае пад сабой адзін вельмі востры «камень». Ствол і іншыя дэталі такіх пісталетаў загадзя не разлічаны пад ціск, які ўтвараецца пры звычайным стрэле. І таму злачынца, націскаючы курок, рызыкуе атрымаць істотныя траўмы.

## «СТВОЛ» БЕЗ РЭГІСТРАЦЫІ

— Нядаўна да нас звярнуўся малады чалавек, — успамінае Аляксандр Крывец. — Яму ад дзеда засталася гладкаствольная паляўнічая стрэльба. І ён хацеў бы захаваць яе як памяць пра родзіча. У прынцыпе, так зрабіць можна. Трэба падысці ў міліцыю і паведаміць пра наяўнасць зброі. Пасля яе трэба будзе штучна зрабіць непрыдатнай. Зброя патрапіць да нас у Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз. І мы ўжо правядзём адмысловую экспертызу, па выніках якой будзе выдадзена заключэнне аб тым, што гэтая зброя не з'яўляецца агнястрэльнай, а ўсяго толькі макетам. Такія экспертызы ва ўпраўленні па Мінску праводзяцца платна па заявах фізічных, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Да балістаў Камітэта судовых экспертыз звяртаюцца нават музеі, якія захоўваюць зброю ў якасці экспанатаў. Іх цікавяць правільныя ўмовы захоўвання. Між іншым, 80—90% зброі, якая калісьці выкарыстоўвалася падчас здымак фільмаў, насамрэч былі сапраўднымі...

— А вось яшчэ адзін цікавы выпадак, — працягвае Аляксандр Крывец. — Прыехаў нехта да нас яшчэ адзін малады чалавек са Слоніма. І падзяліўся незвычайнай ідэяй. Яму ад дзеда таксама засталася прылада, якая знешне нагадвае кулямёт, які можа мацавацца да матацыкла. І вось яму закарцела ў дзень Перамогі сесці на матацыкл, афарбаваны ў адпаведны колер, надзець каску і праехацца, каб аддаць памяць загінулым. Мы правялі экспертызу прылады і выявілі, што яна не мае прыкмет агнястрэльнай зброі.

Раздаецца тэлефонны званок. Эксперт некалькі хвілін гутарыць з чалавекам, а пасля коратка пераказвае змест размовы:

— Чалавек плануе набыць у Маскве пнеўматычную зброю. Мае расійскі пашпарт да яе. І пытаецца: ці будзе гэтага дастаткова для таго, каб зброя легальна знаходзілася на тэрыторыі Беларусі? Ці трэба звяртацца ў органы ўнутраных спраў для таго, каб праводзілі экспертызу? Калі ў пашпарце на пнеўматычную зброю ўказана велічыня дульнай энергіі да 7,5 джоўля, то ёй можна без рэгістрацыі карыстацца на тэрыторыі Беларусі. Але практыка паказвае, што не заўжды звесткі пашпарта адпавядаюць рэчаіснасці. У зброі можа быць зменена канструкцыя спружыны ці газавага балона. Робіцца гэта звычайна ў бок павышэння паказчыка дульнай энергіі. У такім выпадку ў міліцыі зброю рэгістраваць трэба. Таму калі вы сумняваецеся наконт таго, ці трэба рэгістраваць зброю, аддайце яе лепш на экспертызу, якая і пакажа дакладныя даныя.

## ВЫЗНАЧЫЦЬ ПА АДБІТКУ

Судоваму эксперту куля можа паведаміць вельмі шмат. Напрыклад, тып патрона, у якім яна выкарыстоўвалася. Можна звузіць кола пошуку да мадэлі і калібру зброі. Калі ствол зношаны, то ён таксама пакіне адбітак на кулі, у асобных выпадках можна вызначыць нават напрамак стрэла, высветліць, ці сустракала куля нейкую перашкоду падчас палёту, ці быў рыкашэт.

— Для таго, каб атрымаць эксперыментальныя сляды канала ствала на кулях, неабходна стральба ў ціры, — гаворыць Аляксандр Крывец. — Дапамагае ў гэтым кулеўлоўнік.

Вельмі шмат спраў мы маем з пнеўматычнай і траўматычнай зброяй. Па спецыфіцы траўматычная зброя вельмі блізкая да агнястрэльнай. Менавіта таму эксперт яшчэ даследуе, ці ўносіліся канструкцыйныя змены ў яе часткі. Гэта дапаможа высветліць, ці змянілася мэтавае прызначэнне прылады.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Скарб краіны

# ЛЮДЗІ І БАЛОТЫ

**Пра значнасць апошніх — новая кніга айчынных біёлагаў**

**Што мы ведаем пра беларускія балоты? Большасць прыгадае вядомую кнігу Івана Мележа. Але цяпер у аматараў дакладнай інфармацыі з'явілася навуковая крыніца ведаў — выданне «Флора і расліннасць верхавых балот Беларусі». Аўтары, супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук, расказалі пра гісторыю яе стварэння, а таксама падзяліліся цікавымі фактамі пра адно з найгалоўнейшых багаццяў нашай краіны.**

— Работу над выданнем мы распачалі прыкладна ў 2004 годзе, — узгадаў **намеснік дырэктара Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН па навуковай і інавацыйнай рабоце Дзмітрый ГРУМО.** — Тады ў навуцы былі даволі цяжкія часы, але праект падтрымаў адзін з амерыканска-брытанскіх фондаў, які дапамог нам з пошукам замежных валанцёраў для правядзення даследаванняў. Прыкладна ў 2006 годзе мы распачалі актыўную работу па зборы матэрыялу для будучай кнігі — і вось праз дзесяць гадоў яна пабачыла свет.

Пасля прэзентацыі аўтары кнігі выступілі з невялікімі лекцыямі. Так, напрыклад, **навуковы супрацоўнік лабараторыі геабатанікі і картаграфавання расліннасці Інстытута эксперыментальнай батанікі Наталля ЗЕЛЯНКЕВІЧ** распавяла пра гісторыю даследавання нашых балот. Паводле яе слоў, пачынальніцай тут была каралева Бона Сфорца, якая яшчэ ў XVI стагоддзі распачала меліярацыю на Палессі. Маштабныя работы па асушэнні пачалі праводзіцца ўжо пазней, у канцы XIX стагоддзя. На здымках таго часу можна заўважыць, як падчас рыцця каналаў праводзіліся... малебны. Ужо ў мінулым стагоддзі ў сталіцы была створана першая профільная ўстанова — Мінская балотна-доследная станцыя, якая знаходзілася ў раёне Камароўскага балота (яго рэшткі цяпер знаходзяцца ў парку Дружбы народаў). У самым пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў будынак станцыі папала авіябомба, і большая частка вынікаў даваенных даследаванняў была страчана.

**Дацэнт кафедры біягеаграфіі і аховы прыроды Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта Вольга ГАЛАНІНА** расказвала пра ролю балот у экалогіі і выкарыстанні іх у сучаснай гаспадарцы. Як сцвярджае навукоўца, галоўная функцыя гэтых тэрыторый у экасістэме — накапленне вады (так, напрыклад, у балоце Ельня ўтрымліваецца амаль столькі ж вільгаці, колькі ў возеры Нарач). Другі аспект — газаабмен, у прыватнасці, перапрацоўка вуглароду ў кісларод. Цікава, што ў сухія гады балота можа паваротчаць гэты працэс у адвароты бок і паглынаць кісларод. Што датычыцца выкарыстання балот чалавекам, то, па словах навукоўцаў, апошнім часам назіраецца тэндэнцыя, згодна з якой спажыванне торфу ў якасці паліва няспынна змяншаецца. Цяпер гэтае рэчыва больш выкарыстоўваюць як угнаенне. Тым не менш знаходзяцца новыя аспекты выкарыстання балот, так, напрыклад, многія аэрапорты Еўропы пабудаваны якраз на месцах асушаных балот, гэтак жа шырока яны выкарыстоўваюцца ў ваеннай сферы ў якасці палігонаў.

Дзмітрый Грумо гаварыў пра праблемы захавання і аднаўлення беларускіх балот. Галоўнай небяспекай для «лёгкіх Еўропы» навукоўца бачыць меліярацыю, выкіды вуглякіслага газу, а таксама пажары. Да пачатку масавага асушэння 12,3 працэнта тэрыторыі краіны было занята балотамі, сёння гэты паказчык складае ўсяго 4,2 працэнта. Тым не менш Дзмітрый Грумо адзначае ўвагу да праблемы з боку дзяржавы — у Беларусі было наноў забалочана.

51 тысяча гектараў. Для параўнання, у Літве, Латвіі і Эстоніі за той жа час гэтая лічба дасягнула ўсяго 5 тысяч. Пад аховай знаходзіцца 68,8 працэнта тэрыторый верхавых балот. Што датычыцца пажараў, то сітуацыя ў апошнія гады таксама выправілася дзякуючы ў тым ліку намаганням МНС. Яшчэ ў 2002 годзе ўзгаранні тарфянікаў былі праблемай нацыянальнага маштабу, цяпер жа падобныя надзвычайныя сітуацыі — рэдкасць.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Вакол аўто

# «АЙЦІШНІКУ» НЕ ДАГАДЗІЛІ ЧУЖЫЯ МАШЫНЫ

**За хуліганскія дзеянні затрыманы 24-гадовы супрацоўнік ІТ-кампаніі, які, будучы на добрым падпітку, пашкодзіў чужыя аўтамабілі, прыпаркаваныя ў двары жылога дома ў Мінску.**

— Ён, знаходзячыся ў водпуску, сустрэўся са сваімі калегамі. Маладыя людзі выпівалі, пасля чаго хлопец адправіўся дадому. Праходзячы праз двор жылога дома па вуліцы Заслаўскай, ён убачыў прыпаркаваныя аўто і без аніякіх прычын пачаў наносіць па адной з іх удары нагамі і рукамі. Потым, адарваўшы бакавое люстэрка, перамясціўся ды іншай машыны, якую падрапаў ключом, — расказала **прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.** — Маладога чалавека ўбачыў з акна сваёй кватэры гаспадар апошняга аўто. Мужчына выбег на вуліцу і пачаў утрымліваць хулігана, папрасіўшы людзей выклікаць супрацоўнікаў міліцыі. З заявамі адносна прыцягнення маладога чалавека да адказнасці звярнуліся ўладальнікі абодвух пашкоджаных аўтамабіляў. Хулігану пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да трох гадоў.

# ЗАТРЫМАЛІ СЕРЫЙНАГА ЗГОНШЧЫКА

**23-гадовы мінчанін падазраецца ў здзяйсненні двайнога згону.**

Дзякуючы камерам відэаназірання, усталяваным на даху крамы з боку вуліцы Брыкета, затрыманы падазраваны ў здзяйсненні згону матацыкла «Хорс Z-150». Было ўстаноўлена, што зламыснік датычны яшчэ да аднаго такога выпадку.

Матацыкл мінчанін неўзабаве прадаў, пасля чаго адправіўся да сябра ў Вілейку. Атрыманыя за «двухколавага каня» сродкі пасля некалькіх застолляў скончыліся. У ходзе чарговага сумеснага распівання спіртных напояў хлопец скраў ключы ад аўтамабіля «Форд», які належыць яго сябру, і забраў машыну. Раніцай кампанія не выявіла ні хлопца, ні аўто, пасля чаго звярнулася з заявай у міліцыю. А ў гэты час згоншчык ужо даехаў да Мінска, дзе і быў затрыманы сышчыкамі.

Па інфармацыі Фрунзенскага РУУС г. Мінска, устаноўлена, што хлопец прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за аналагічныя злачынствы. Яшчэ ў 2013 годзе ён здзейсніў згон шасці аўтамабіляў, а праз месяц пасля вызвалення зноў узяўся за старыя крымінальныя справы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Па слядах гучнай справы

# І радыёстанцыі не дапамаглі...

**Пракуратура Мінскай вобласці накіравала ў Жодзінскі гарадскі суд крымінальную справу ў адносінах да 9 асоб, якія абвінавачваюцца ў крадзяжы ў асабліва буйных памерах маёмасці адкрытага акцыянернага таварыства «БелАЗ».**

Пяцёра з дзевяці зламыснікаў працавалі на гэтым прадпрыемстве, у тым ліку кантралёрамі прапускнога пункту пазаведамаснай аховы, майстрамі цэхаў, слесарам-сантэхнікам. З верасня 2014-га па кастрычнік 2015 года яны ўкралі запасных частак, вузлоў і агрэгатаў да кар'ернай аўтамабільнай тэхнікі на суму 148 тыс. дэнамінаваных рублёў.

Як паведаміла **старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Ларыса ПАРХІМОВІЧ,** зламыснікі ажыццяўлялі сваю злачынную дзейнасць выключна ноччу. Пры гэтым адключалі камеры відэаназірання, а для сувязі выкарыстоўвалі радыёстанцыі і мабільныя тэлефоны. Крадзенае яны вывозілі на арандаваным грузавіку ў загадзя падрыхтаваныя часовыя склады, якія знаходзіліся на падворку прыватнага дома адной з вёсак Смалявіцкага раёна. «Канфіскат» у наступным рэалізоўваўся па падробленых дакументах у Расію. Такая канспірацыя дазваляла зламыснікам не трапляць у поле зроку адпаведных службаў.

Органамі папярэдняга расследавання дзеянні сямі абвінавачаных кваліфікаваны па ч. 4 арт. 205 Крымінальнага кодэксу як тайны крадзеж маёмасці, здзейснены групай асоб у асабліва буйным памеры, а двух — як садзейнічанне ў тайным крадзяжы маёмасці (ч. 6 арт. 16, ч. 4 арт. 205).

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# Асаблівасці ненацыянальнага футбола,

## ці Як за чвэрць стагоддзя ў краіне прыжылася самая амерыканская гульня

**Першая каманда па амерыканскім футболе ў Беларусі з'явілася на самым старце 90-х, а ў гэтым годзе «Мінскія Зубры» ўжо святкуюць сваё 25-годдзе. За гэты час клуб станавіўся пераможцам чэмпіянату СНД і неаднаразовым прызёрам адкрытага чэмпіянату Украіны. Менавіта беларуская каманда, на думку многіх спецыялістаў, заслужыла права называцца адной з найлепшых дружын Усходняй Еўропы. У свой маленькі юбілей «Зубры» здзейснілі даўнія мары — нарэшце сталі ўладальнікамі залатых медалёў Украінскага чэмпіянату і выйгралі зусім новы турнір — Балтыйскую лігу.**


*Алег СТЭФАНОВІЧ (справа) з Кубкам Балтыйскай лігі.*

* * *

Перад пачаткам сезона кіраўнікі «Мінскіх Зуброў» вырашылі правесці невялікія рэформы, як унутры клуба, так і ў падрыхтоўцы саміх футбалістаў. За аснову былі ўзяты ўзор развіцця найлепшых клубаў Еўропы. Як бачым, гэта дало наглядны вынік — перамога ў чэмпіянаце Украіны, дзе беларусы не маглі падняцца на першую прыступку п'едэстала цэлых 7 гадоў.

**За фінальным матчам Нацыянальнай футбольнай лігі ў ЗША звычайна назірае больш за сотню мільёнаў чалавек. Важнасць гэтай спартыўнай падзеі настолькі вялікая, што ў 1985 годзе з-за вырашальнага матча перанеслі інаўгурацыю амерыканскага прэзідэнта Рональда Рэйгана.**

— Заўсёды спыняліся за крок, увесь час чагосьці нам не хапала, — расказвае **адзін з гульцоў лініі атакі Алег СТЭФАНОВІЧ.** — У гэтым годзе ўдалося роўна прайсці ўсю дыстанцыю рэгулярнага чэмпіянату (у ім удзельнічала 20 каманд), а ў серыі плэй-оф перамаглі адну з наймацнейшых украінскіх дружын «Кіеўскіх бандытаў». Перамога ў гэтым чэмпіянаце была нашай даўняй марай і задачай, і нарэшце мы яе адолелі. На самай справе ва Украіне наватбыў невялікі скандал з гэтай нагоды, маўляў, чаму нацыянальны кубак з'язджае ў іншую краіну.

У клубе адзначаюць, што адным з галоўных фактараў поспеху стала запрашэнне легіянераў. У гэтым годзе ў Мінск прыехалі сапраўдныя родапачынальнікі гэтага віду спорту — амерыканцы. У камандзе з'явіліся 3 новыя гульцы, якія дзейнічалі на ключавых пазіцыях. Гэта квотэрбэк Джымі Расел, лайнбэкер Майкл Фол, прынімаючы і адначасова гулец задняй лініі Трой Райс.

— Гэта дастаткова кваліфікаваныя і вядомыя футбалісты ў Еўропе. Яны ўжо даўно гуляюць на нашым кантыненце і маюць вельмі добры рэйтынг, — падкрэслівае Алег.

Джымі Расел да пераходу ў «Зубры» стаў чэмпіёнам Францыі, Трой Райс быў чэмпіёнам Венгрыі, Украіны, дамогся добрых поспехаў у Фінляндыі. Райс кажа, што каманда, дзе ён гуляе, абавязкова становіцца чэмпіёнам.

Немалаважна, што ўсе легіянеры былі сур'ёзна ўцягнутыя і ў трэніровачны працэс, што дапамагло па ходу сезона перабудаваць усю гульню каманды. Трэнеры таксама адзначылі, што беларускія гульцы побач з прафесіяналамі такога ўзроўню нашмат хутчэй прагрэсуюць і самі.

* * *

Акрамя адкрытага чэмпіянату Украіны, «Мінскія Зубры» сёлета прынялі ўдзел у Балтыйскай лізе амерыканскага футбола. Гэты турнір закліканы аб'ядналь еўрапейскія клубы і даць добрую гульнявую практыку. Цяпер да лігі праяўляюць вялікую цікавасць прадстаўнікі гэтага віду спорту ў Скандынавіі, Польшчы, Вялікабрытаніі. Сёлета ў турніры прымалі ўдзел латышы, фіны, палякі і беларусы.

— У Балтыйскай лізе мы абыгралі топ-клуб з Польшчы «KOZLY» і фінскую каманду «EAGLES», якая знаходзіцца на добрым рахунку ў Фінляндыі, а фінскі чэмпіянат, дарэчы, па праве лічыцца адным з наймацнейшых у Еўропе. У Балтыйскай лізе ніхто не чакаў ад нас такога спрыту, а мы ўзялі і выйгралі яе, — кажа кардынатар беларускай атакі.



* * *

Пра тое што развіццё амерыканскага футбола ў Беларусі набірае абароты, галоўным чынам гаворыць колькасць клубаў, якая за апошнія гады прыкметна ўзрасла. Сёння ў нас 6 каманд у розных абласцях краіны.

Цяпер, пакуль гульцы ў заслужаным адпачынку, кіраўніцтва клубаў ужо будуе планы на наступны сезон. Практычна са стопрацэнтнай упэўненасцю можна казаць, што ў 2017 годзе ў краіне ўпершыню будзе праведзены нацыянальны чэмпіянат па амерыканскім футболе. На гэтым і плануюць сканцэнтраваць сваю ўвагу «Мінскія Зубры».

— Калі ў чэмпіянат Беларусі заявяцца ўсе клубы, то, несумненна, там будзе добрая канкурэнцыя, — дзеліцца чаканнямі Алег Стэфановіч. — У Мінску, акрамя нас, ёсць яшчэ адна вельмі моцная каманда — «Літвіны», якія ў гэтым годзе прэтэндавалі на выхад у фінал чэмпіянату Расіі. Калі ў фінальным матчы нашага першынства сыдуцца «Зубры» і «Літвіны», то гэта будзе суперматч. Мы не сустракаліся ўжо тры гады і, улічваючы нашы дастаткова складаныя адносіны, — мы ўсё ж такі канкуруем за права называцца найлепшым клубам Беларусі — гэты чэмпіянат пакажа, хто варты такога звання.

* * *

За 25 гадоў «Мінскія Зубры» абзавяліся дастатковай колькасцю балельшчыкаў, нягледзячы на тое, што амерыканскі від спорта с цяжкасцю прыжываецца ў Беларусі, цікавасць гледачоў ужо сфарміравалася.

— Сёння да нас на гульні прыходзяць людзі, можа быць, яшчэ не ў той колькасці, як хацелася б, але дакладна магу сказаць, што збіраць трыбуны на ўзроўні 1-й лігі нашага чэмпіянату краіны па класічным футболе мы можам. Прытым што няма ні рэкламы, ні анонсаў, выключна «сарафаннае» радыё.

Сёння паспрабаваць сябе ў амерыканскім футболе можа кожны ахвотны, дастаткова зазірнуць на трэніроўку да «Зуброў». Там вам выдадуць экіпіроўку і навучаць асновам гульні. Калі чалавек мае добрую фізічную падрыхтоўку і хутка прагрэсуе, дастаткова месяца, каб трапіць у асноўную каманду.

— Амерыканцы ў гэтым плане малайцы, яны прыдумалі спорт, які не патрабуе асаблівых фізічных даных. Бо ў амерыканскім футболе шмат гульнявых пазіцый, дзе знайсці сябе зможа любы чалавек. Вядома, лепш, калі прыходзяць людзі хоць бы мінімальна знаёмыя са спортам, але галоўнае быць здаровым і мець жаданне, тады ўсё атрымаецца і гэты спорт вас дакладна зацягне, — запэўнівае Алег.



Узрост таксама не мае значэння, але раней за 16 гадоў прыходзіць не варта, пакуль на базе клуба няма дзіцячай школы, але ўжо ёсць фармклуб — «Лосі».

* * *

Нягледзячы на ўсе дасягненні, «Мінскія Зубры» ўсё ж такі яшчэ аматарская каманда, спартсмены там не атрымліваюць зарплату, таму іх асноўная прафесійная дзейнасць даволі розная — ёсць будаўнікі, праграмісты, архітэктары, кіроўцы, менеджары і студэнты. Гэта значыць, у футбол гуляюць усе.

З боку здаецца, што амерыканскі футбол — адзін з самых траўманебяспечных гульнявых відаў спорту, аднак спецыялісты адзначаюць, што менавіта ў звычайным класічным футболе больш за ўсё пашкоджанняў.

— Тут праблема ў іншым, у нашых гульцоў павінна быць добрая пастаянная гатоўнасць да нагрузак, таму што яны ў нас спецыфічныя, калі чалавек не гатовы, то, вядома, лёгка атрымаць траўму. Для людзей, якія прафесійна адносяцца да справы, гэта не больш траўманебяспечны від спорту, чым астатнія, — кажа футбаліст з дзесяцігадовым стажам.

**Уладзімір Высоцкі, пабываўшы ў ЗША ў 70-х гадах, прыйшоў у захапленне ад гэтай гульні. Пасля ён напісаў песню «Анёлы азарту».**

Яшчэ калі вам здаецца, што амерыканскі футбол — гэта хаатычны рух людзей па полі, то вы памыляецеся. Гэта досыць разумная гульня, у кожнага футбаліста свая пазіцыя і кожны дакладна ведае свой маршрут. У амерыканскім футболе існуюць тысячы камбінацый, якую менавіта гуляць, вырашае трэнерскі штаб.

— Галоўным чынам на полі ў нас ідзе барацьба за тэрыторыю. Розыгрыш праходзіць вельмі хутка — літаральна 5—7 секунд, за гэты час трэба паспрабаваць прайсці максімальную адлегласць. Тут у сілу ўступае трэнерскае майстэрства: разумная расстаноўка гульцоў, падманныя прыёмы, — тлумачыць Алег.

Амерыканскі футбол уваходзіць у Кнігу рэкордаў Гінеса, як від спорту з самым шырокім зборам правілаў. Але, калі вы ніколі не былі на матчах, не палохайцеся, што будзеце выглядаць там «белай варонай», на стадыёне заўсёды ёсць каментатар, які тлумачыць асновы гэтых правілаў.

— Праз палову сустрэчы нашы новыя гледачы ўжо выразна разумеюць, што адбываецца на полі, а прыйшоўшы на матч у наступны раз, чалавек ужо зможа лічыць сябе практычна экспертам.

# ЖАДАННЕ! МАЙСТЭРСТВА? ВЫКАНАННЕ...

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» раскажам пра гульню футбалістаў у матчы з Балгарыяй, выступленне айчынных гандбольных клубаў у міжнародных турнірах і даведаемся пра падрабязнасці падрыхтоўкі Дар'і Домрачавай да вяртання ў біятлон.**

***1. Футбалісты зборнай Беларусі завяршылі сезон адборачным матчам чэмпіянату свету-2018 супраць каманды Балгарыі.*** У гасцях нашы суайчыннікі былі слабейшыя за гаспадароў — 0:1.

*— Такую гульню саперніка мы чакалі і рыхтаваліся да яе: у балгар яна будуецца на хуткім пераходзе з абароны ў атаку. І адна з нашых страт мяча ў пачатку матчу прывяла да контрвыпаду, які завяршыўся голам,* — пракаментаваў паражэнне сваёй дружыны **галоўны трэнер беларусаў Аляксандр ХАЦКЕВІЧ.** *— Потым валодалі ініцыятывай. Але ў адным моманце выратаваў варатар, а недзе нам не хапіла выканання і ўдачы. У прынцыпе сустракаліся роўныя каманды па падборы футбалістаў. Аднак аднаго жадання мала: трэба і майстэрства, і выкананне,* — дадаў настаўнік.

У другім нядзельным матчы 4-га тура ў кваліфікацыйнай групе А футбалісты Люксембурга сустракаліся з камандай Нідэрландаў і саступілі — 1:3. У матчы лідараў французы 11 лістапада ў Парыжы атрымалі валявую перамогу над шведамі — 2:1. ***Становішча пасля чатырох тураў:*** Францыя — 10 ачкоў (розніца мячоў — 7-2), Швецыя — 7 (6-3), Нідэрланды — 7 (8-4), Балгарыя — 6 (6-10), Беларусь — 2 (2-6), Люксембург — 1 (5-9).

Адборачны турнір сусветнага першынства адновіцца вясной 2017 года.

***2. Дзве залатыя ўзнагароды заваявалі беларускі Таццяна Мацко (64 кг) і Марына Жарская (52 кг) на чэмпіянаце свету па самба ў Балгарыі.*** Дзяўчаты змаглі ўпэўнена прайсці па турнірнай сетцы, а ў фінале Таццяна была мацнейшай за Дзінару Жумабаеву з Казахстана. Марына атрымала перамогу ў паядынку з расіянкай Ганнай Харытонавай.

Акрамя таго, Святлана Цімашэнка стала сярэбраным прызёрам у катэгорыі да 80 кг. Андрэй Казусёнак заняў другое месца ў катэгорыі да 100 кг, а Сцяпан Папоў стаў уладальнікам бронзавай узнагароды ў катэгорыі да 74 кг. У раздзеле баявога самба трэцяе месца ў катэгорыі да 82 кг у Яўгена Алексеевіча.

***3. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў дамашнім матчы Лігі чэмпіёнаў перайграў шведскі «Крысціянстад» — 32:27.*** Дзякуючы гэтай перамозе БГК зарабіў яшчэ два ачкі і з шасцю баламі ў актыве размясціўся на пятай пазіцыі ў турнірнай табліцы.

Пасля шасці тураў з 10-ю ачкамі лідзіруе ў групе «Вардар», следам ідзе «Райн Лявен», у якога на бал менш. Замыкае тройку «Віве», у яго 8 ачкоў.

Наступную гульню ў Лізе чэмпіёнаў «мяшкоўцы» зноў правядуць у Брэсце. Паядынак супраць «Цэле» адбудзецца 19 лістапада.

А вось гандбалісты мінскага СКА атрымалі першыя перамогі ў розыгрышы Балтыйскай лігі. Пасля двух паражэнняў на старце новага сезона ў трэцім паядынку, які адбыўся ў Клайпедзе, былі абыграны літоўскі «Драгунас» — 33:26, а днём пазней і рыжскі «Цэлтніекс» — 40:26.

Нагадаем, 19 лістапада СКА працягне выступленне ў розыгрышы Кубка ЕГФ. Армейцы на сваёй пляцоўцы сустрэнуцца з французскім «Сен-Рафаэлем».

***4. Нацыянальная зборная па біятлоне адправілася на заключны перад стартам сезона збор у нарвежскі Шушэн.*** Там іх ужо чакае лідар жаночай зборнай Дар'я Домрачава, якая прыступіла да трэніровак пасля нараджэння дачкі. Не менш знакаміты і тытулаваны муж Дашы Уле-Эйнар Б'ёрндален для больш эфектыўнай падрыхтоўцы да сезона нават аддаў жонцы свой знакаміты трэйлер.

*— На працягу бліжэйшага часу Дар'я будзе мець магчымасць выкарыстоўваць трэйлер для падрыхтоўкі. Ёй трэба самым лепшым чынам трэніравацца і рыхтавацца да сезона. Для свайго вяртання яна будзе выкарыстоўваць яго больш, чым я. Вельмі важна, каб Дар'я вярнулася на той узровень, на якім была раней,* — расказаў Б'ёрндален.

У знакаміты 20-тонны трэйлер нарвежскага біятланіста ўваходзяць трэнажорная зала, трэдбан (бегавая дарожка), шэсць спальных месцаў, кухня і ванна.

Біятлонны сезон пачнецца праз два тыдні. Першы этап Кубка свету стартуе 25 лістапада ў шведскім Эстэрсундзе. Домрачава спадзяецца вярнуцца да гонак у студзені.

Матэрыялы падрыхтавала
Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by

# ШАНЦ ДЛЯ «ЗЯМЛІ КЕДРАЎ»

## КАЛІ НЕВЯЛІЧКІ ЛІВАН НАБУДЗЕ БЫЛУЮ МОЦ?



**Парламент Лівана з 46-й(!) спробы абраў новага прэзідэнта краіны, ім стаў ветэран ліванскай палітыкі 81-гадовы генерал Мішэль Аун. Эксперты спадзяюцца, што такім чынам будзе пакладзены канец палітычнаму крызісу ў краіне, выкліканаму завяршэннем прэзідэнцкага тэрміну папярэдняга кіраўніка дзяржавы Мішэля Сулеймана. Ліван 29 месяцаў жыў без прэзідэнта, бо галоўным палітычным сілам не ўдавалася прыйсці да кансэнсусу па прымальнай кандыдатуры. Нарэшце ў краіны з'явіўся рэальны шанц для вяртання ў эканамічныя лідары рэгіёна.**



### Пірог цывілізацый

Для таго, каб на свае вочы пазнаёміцца са шматвяковай гісторыяй чалавецтва, варта наведаць Ліван. Малюсенькую (агульная плошча — усяго 10 452 км$^2$ (для параўнання: чацвёртая частка Гомельшчыны), па памерах краіна з'яўляецца 161-й у свеце) «зямлю запаветную». Дзяржава з яе ўнікальным размяшчэннем у Заходняй Азіі падобная на слоены пірог цывілізацый. Як быццам усе сусветныя культуры і рэлігіі прызначылі спатканне ў адным месцы — у розны час. У падмурках мячэці Аль-Амар — рымскі храм Юпітэра, перароблены ў візантыйскую царкву, крыжакі ўзвялі храм у гонар Іаана Хрысціцеля, а мусульмане перабудавалі яго ў мячэць Фарух аль-Іслам («Перамога ісламу»).

Старажытная дзяржаўнасць, якую сімвалізуе велічны ліванскі кедр, нарадзілася 3 тысячы гадоў таму і бярэ адлік з заснавання знакамітых фінікійскіх гандлёвых гарадоў Цір і Сідон — найбуйнейшых мегаполісаў таго часу. Легендарная міжземнаморская Фінікія паспела пабываць у руках шматлікіх старажытных дзяржаў — Асірыі, Персіі, Македоніі, Рыма, Візантыі, і гэта далёка не поўны спіс. Багаты край невыпадкова прыцягваў да сябе ўвагу — ён знаходзіўся на стыку важных гандлёвых шляхоў, меў зручныя гавані, яго засялялі умелыя і прадпрымальныя людзі. Старажытны Ліван быў сапраўдным залатой жылай, бо яго жыхары стварылі велізарную для таго часу гандлёвую сетку, якая цягнулася праз усё Міжземнамор'е. А асобныя купецкія шляхі даходзілі нават да Брытанскіх астравоў.

Тэрыторыя Лівана ў складзе Вялікай Сірыі больш за 400 гадоў уваходзіла ў Асманскую імперыю. Пасля паражэння Турцыі ў Першай сусветнай вайне і распаду Асманскай імперыі ў 1918 годзе акупавана брытанскімі войскамі. Пасля была перададзена Францыі. У 1926-м Ліван стаў асобнай тэрытарыяльнай адзінкай, аднак пад кіраваннем адміністрацыі Французскага мандата Сірыі.

Як вядома, у чэрвені 1940 года Францыя была акупавана Германіяй. Ужо ў лістападзе ў Ліване прайшлі першыя выбары і сфарміраваны ўрад. У 1943 годзе краіна афіцыйна набыла незалежнасць. Тады ж няпісаны «Нацыянальны пакт» усталяваў правіла, у адпаведнасці з якім прэзідэнтам Лівана павінен быць хрысціянін-марон, прэм'ер-міністрам — мусульманін-суніт, а спікерам парламента — мусульманін-шыіт. У 1948 годзе Ліван удзельнічаў у першай араба-ізраільскай вайне. Пасля паражэння Арабскай вызваленчай арміі падпісаў з Ізраілем пагадненне аб спыненні агню. 100 тысяч арабскіх бежанцаў перабраліся ў Ліван. З 1956 года тут пачалі ўзмацняцца супярэчнасці паміж хрысціянамі і усульманамі, якія выліліся ў маі 1958 года ў грамадзянскую вайну. Каб утрымаць уладу ў краіне, прэзідэнт Каміль Шамун звярнуўся па ваенную дапамогу да ЗША. Амерыканскія войскі знаходзіліся ў краіне з ліпеня па кастрычнік да поўнай нармалізацыі абстаноўкі.

У 1975 годзе ў Ліване пачалася другая грамадзянская вайна паміж мусульманскай і хрысціянскай групамі насельніцтва. Яна працягвалася 15 гадоў, разбурыўшы некалі квітнеючую эканоміку краіны, і забрала жыцці больш чым 150 тысяч жыхароў. Кровапраліцце спынілася ў 1990-м падпісаннем Таіфскіх пагадненняў. У 1976 годзе па просьбе тагачаснага ўрада на тэрыторыю краіны ўвайшлі сірыйскія войскі. Фактычная акупацыя працягвалася да 2006-га, нягледзячы на афіцыйныя патрабаванні прэзідэнтаў Лівана аб вывадзе вайсковых падраздзяленняў.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны ў Ліване наступіў нядоўгі перыяд адноснага спакою. Аднак стабілізацыя была перапрана ўрадавым крызісам, справакаваным забойствам экс-прэм'ера краіны Рафіка Харыры, гэта супала з вывадам з краіны сірыйскіх войскаў і ізраільска-ліванскім канфліктам у 2006 годзе. У 2011-м у Ліване разгарэлася супрацьстаянне паміж урадам і ісламістамі. А летась па краіне пракацілася хваля пратэстаў з-за бяздзейнасці ўрада і палітычнага крызісу, падчас якога парламент не можа абраць прэзідэнта.

### Унікальная мадэль

Як сцвярджаюць аналітыкі, ліванская эканоміка — яскравы прыклад ліберальнай мадэлі, што характарызуецца адкрытай гандлёвай і інвестыцыйнай палітыкай, свабоднымі рынкавымі цэнамі, развітымі знешнеэканамічнымі сувязямі. Высокая рэпутацыя банкаўскага сектара спрыяла прызнанню Лівана ў якасці банкаўска-фінансавага цэнтра і «Швейцарыі» блізкаўсходняга рэгіёна. Краіна абрала ў сярэдзіне 1940-х гадоў шлях развіцця, які заснаваны на прынцыпах кропкавага дзяржаўнага ўмяшання ў эканоміку ў мэтах садзейнічання мясцоваму і замежнаму прыватнаму прадпрымальніцтву, прадастаўлення замежнаму капіталу роўных магчымасцяў з мясцовым капіталам і захавання ліберальнага валютнага і мытнага рэжыму.



У выніку грамадзянскай вайны 1975—1990 гадоў сур'ёзна пацярпелі многія галіны нацыянальнай гаспадаркі, была разбурана інфраструктура, падарваныя пазіцыі краіны як важнага эканамічнага, гандлёвага і банкаўскага цэнтра на Блізкім Усходзе. Вайна прывяла да высокай знешняй запазычанасці, росту інфляцыі, хранічнага дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту.

**Няпісаны «Нацыянальны пакт» усталяваў правіла, у адпаведнасці з якім прэзідэнтам Лівана павінен быць хрысціянін-марон, прэм'ер-міністрам — мусульманін-суніт, а спікерам парламента — мусульманін-шыіт.**

Крэдыты і прыцягненне замежных інвестыцый спрыялі паскарэнню працэсу аднаўлення і рэканструкцыі інфраструктуры ліванскай эканомікі. Прыкметнаму росту шмат у чым паспрыяла рэалізацыя ўрадавага плана «Гарызонт-2000», накіраванага на аднаўленне краіны, на яго ўвасабленне спатрэбілася $18 млрд. Вынікі відавочныя — праз 10 гадоў пасля заканчэння грамадзянскай вайны — у пачатку 2000-х — краіна зноў пачынае займаць ключавае становішча ў гандлі і фінансава-банкаўскай сферы на Блізкім Усходзе.

Ліван адносіцца да нешматлікай групы дзяржаў свету, у якіх у сферы абслугоўвання і гандлю ствараецца больш за палову гадавога нацыянальнага даходу. Бейрут гістарычна развіваўся як міжнародны фінансавы цэнтр, куды сцякаліся сродкі, атрыманыя ад экспарту нафты з усяго Сярэдняга Усходу. Працяглыя гандлёвыя і культурныя сувязі як з еўрапейскімі, так і з арабскімі дзяржавамі дазволілі Лівану ператварыць гандаль у адзін з найважнейшых сектараў эканомікі.

З 1950-га па 1975-ты нацыянальны даход Лівана павялічваўся ў сярэднім больш, чым на 8% у год. Пасля 1975-га гэты паказчык знізіўся прыблізна да 4%. Гандаль і рынак паслуг займаюць 75% ВУП Лівана. Краіна лічыцца цэнтрам эканамічнага супрацоўніцтва і гандлю паміж еўрапейскімі, блізкаўсходнімі і афрыканскімі краінамі. Сектар рынку паслуг уключае ў сябе турызм, IT-паслугі, банкаўскія і фінансавыя паслугі. Ліван становіцца фінансавым і банкаўскім цэнтрам арабскага свету.

Банкаўскі сектар краіны лічыцца адным з самых эфектыўных у свеце. Ліванскія банкі маюць неабмежаванае права пераводзіць любыя сумы ў любой валюце. Рахункі строга канфідэнцыйныя і могуць адкрывацца ў любых грашовых адзінках. Банкаўская тайна, уключаючы імёны кліентаў, звесткі аб іх актывах, аперацыях, якія праводзяцца, у адпаведнасці з ліванскім заканадаўствам не можа быць раскрытая ніякім адміністрацыйным, ваенным, судовым уладам або прыватным асобам. Выключэннем можа быць толькі адпаведнае асобнае рашэнне парламента краіны. Дарэчы, рух капіталу на Блізкім Усходзе па большай частцы кантралюецца менавіта ліванскімі фінансістамі.

Падаткі ў Ліване традыцыйна нізкія. Заканадаўства краіны дазваляе без асаблівых цяжкасцяў ствараць розныя віды камерцыйных кампаній, уключаючы афшоры і холдынгі. Інвестарам прадастаўляюцца шырокія магчымасці ў розных галінах эканомікі, сярод якіх — турызм, сельская гаспадарка, будаўнічы і банкаўскі бізнес, транспарт, прамысловая вытворчасць.

### На ўсходзе Міжземнамор'я

Ліван атрымлівае вялікую выгаду ад згуртаванай і прадпрымальнай дыяспары. Паводле асобных звестак, грашовыя пераводы ад ліванцаў за мяжой членам сваіх сем'яў складаюць $8,2 млрд — 1/5 частка эканомікі краіны. Кіраўнік аддзела даследаванняў і аналізу Byblos Bank Насіб Габрыль падлічыў, што ліванцы за мяжой дадаюць краіне больш чым $1400 на душу насельніцтва ў год. У 2011-м Ліван быў на чацвёртым месцы сярод 18 арабскіх дзяржаў па аб'ёме інвестыцый, якія склалі $4 млрд. У 2012 годзе прамыя замежныя інвестыцыі склалі $3,78 млрд, што зрабіла Ліван адным з найбуйнейшых іх атрымальнікаў у рэгіёне — трэцяе месца пасля ААЭ і Саудаўскай Аравіі.

Аднак сірыйскі крызіс аказвае вельмі негатыўнае ўздзеянне на ліванскую эканоміку. Дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту ў 2013 годзе дасягнуў 4 млрд долараў, тэмпы росту эканомікі ўпалі на 1,5%. Цалкам падарванымі аказаліся такія ключавыя артыкулы даходаў, як гандаль і турызм. Закрыццё транзітных шляхоў праз сірыйскую тэрыторыю рэзка знізіла ўзровень ліванскага экспарту і рээкспарту ў краіны Персідскага заліва, Ірак і Іарданію. Сірыйскія бежанцы складаюць ледзьве не палову (1,5 млн з 4 млн) насельніцтва невялікага Лівана. З-за вялізнага патоку перасяленцаў у краіне, дзе не хапае працоўных месцаў, расцуць беспрацоўе і палітычная напружанасць.

Разам з тым, па паведамленнях ліванскай газеты «The Daily Star», нягледзячы на вайну ў суседняй Сірыі, банкаўска-фінансавы сектар, захоўваючы сваю міжнародную рэпутацыю, працягвае развівацца ў станоўчым рэчышчы. Ліван заплаціў высокую цану за грамадзянскую вайну, таму сёння дзяржава імкнецца мінімізаваць негатыўны ўплыў рэгіянальных палітычных канфліктаў, якія прадстаўляюць вялікую небяспеку для эканамічнага развіцця і дабрабыту краіны.

**Рух капіталу на Блізкім Усходзе па большай частцы кантралюецца менавіта ліванскімі фінансістамі.**

Сённяшні Ліван — даволі нестабільная дзяржава, якая фактычна знаходзіцца ў стане перманентнай грамадзянскай вайны. І гэта яе сённяшняе становішча амаль цалкам абумоўлена падзеямі другой паловы ХХ стагоддзя. Але ж пераканаць сунітаў, шыітаў і хрысціян на Блізкім Усходзе нешта зрабіць разам, тым больш падзяліць уладу, удалося толькі тут, у самай усходняй кропцы Міжземнага мора. Ліванцы з упартасцю, якая выклікае павагу, дзесяцігоддзямі шукаюць шлях да згоды. Цяпер у іх зноў з'явіўся шанц.

**Захар БУРАК.** burak@zviazda.by



## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 420/С-54851 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание для ремонта и технического обслуживания автомобилей), площадью 865,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Притыцкого, 18 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 441300000002000236 (назначение – для обслуживания здания для ремонта и технического обслуживания автомобилей), площадью 0,5725 га, расположенном по адресу: г. Лида, ул. Притыцкого, 18 |
| **Начальная цена продажи** | 142 000 р. (сто сорок две тысячи рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 14 200 р. (четырнадцать тысяч двести рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | ОАО «Лидастройматериалы», 231294, г. Лида-14, ул. Притыцкого, 22, тел. 8-0154-55-82-99 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 29 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.01.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 23 ноября 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

# ОАО «ПМК-8»

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ**

**25 ноября 2016 года**

**ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Форма проведения очная.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Утверждение Устава в новой редакции.
2. О подаче заявления должника в экономический суд Минской области о своей экономической несостоятельности (банкротстве).

Собрание состоится по адресу: г. Червень, ул. Октябрьская, 1а. Актовый зал ОАО «ПМК-8». Начало собрания – в 14.00.

Регистрация участников собрания будет осуществляться с 11.00 до 13.00 в день и по месту проведения собрания по предъявленным документам, удостоверяющим личность.

Список акционеров ОАО «ПМК-8», имеющих право на участие в собрании, будет составлен на 25 ноября 2016 года депозитарием ЗАО «МТГ» на основании данных реестра акционеров.

*Наблюдательный совет ОАО «ПМК-8».*

УНП 600004004

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» 30 ноября 2016 года проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).

**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

| | | Лот 1 |
|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 46 |
| 2 | Кадастровый номер | 623684204101000200 |
| 3 | Площадь земельного участка, га | 0,0971 |
| 4 | Срок аренды (лет) | 99 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 6 | Инженерная инфраструктура * | – |
| 7 | Условия, предусмотренные в решении местного органа власти об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона | – |
| 8 | Расходы по подготовке документации (руб.) | 1 670,45 |
| 9 | Начальная цена права заключения договора аренды (руб.) (в денежных единицах 2000 года, руб.) | 3 061,68 (30 616 800) |
| 10 | Задаток (руб.) | 612,00 |
| 11 | Ограничения (обременения) прав на земельный участок | Водоохранная зона реки Свислочь |

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте. Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.*

**Аукцион состоится 30 ноября 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5.**

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, по 24 ноября 2016 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.**

**Контактный телефон + 375 (17) 205-46-61.**

**Задатки перечисляются не позднее 24 ноября 2016 г. на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**- внести задаток не позднее 24 ноября 2016 г.** в вышеуказанном (графа 10 таблицы) размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона);

**- представить в Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» – организатору аукциона следующие документы:**

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;
- подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на внесение платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

**дополнительно представляется:**

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому райисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

